ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 115 (4367)
АЎТОРАК, 24 мая 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 53

СЕНЬНЯ Ў НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Бальшавіцкія пастановы ажыцьцяўляць па бальшавіцку! Д. БОГЕН — Барацьба кіпіць (2 стар.). Л. ЧАРНЯКОЎ — Моцнае партыйнае кіраўніцтва — зарука пасьпяховай перабудовы рабсельскораўскага руху (3 стар.).

АГЛЯД ДРУКУ — Узор пастаноўкі абарончай работы (2 стар.).

ЛІСТ ТАВ. ГІКАЛО І КАЛНІНА ЎСІМ ГК і РК КП(б)Б, СТАРШЫНЯМ КК-РСІ І РЭДАКТАРОМ ГАЗЭТ (1 стар.).

Пяцідзеньнік штурму ператварыць у масавы паход за датэрміновае сканчэньне плянаў веснавой сяўбы (1 стар.).

Вышэй ролю партыйных груп у разгортваньні ўнутрыпартыйнай і масавай работы на вытворчасьці (2 стар.).

Партарганізацыі і рабочыя Менску выступаюць у паход за разгортваньне калгаснага гандлю (3 стар.).

Найшырэйшыя масы працоўнага насельніцтва зробяць актыўным ўдзельнікамі санітарнай абароны краіны (з рэфэрату старшыні ЦК таварыства Чырвонага крыжу — тав. ХАЦКЕВІЧА) (3 стар.).

Лабінскія калгасьнікі даюць адпор застрэльшчыкам інтэрвенцыі (4-я стар.).

БАЛЬШАВІЦКІЯ ПАСТАНОВЫ АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЦЬ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ!

Няўхільны рост індустрыялізацыі абумовіў пасьпяховае прасоўваньне ўперад па шляху сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, па шляху будаўніцтва калгасаў і саўгасаў.

«Дзякуючы ажыцьцяўленьню палітыкі ленінскай партыі краіна выйшла з крызісу збожжавай гаспадаркі і перамагае труднасьці, выкліканыя засухай мінулага году ва ўсходніх раёнах СССР, са значна большым посьпехам, чым гэта мела месца ў папярэднія засушлівыя гады, калі дробная сялянская гаспадарка яшчэ пераважала ў нашай краіне» (з пастановы ЦК і СНК СССР аб збожжазагатоўках).

Перавага ў нашай гаспадарцы буйной сацыялістычнай сельскай гаспадаркі забясьпечвае пасьпяховае вырашэньне і мясной праблемы, праблемы тэхнічных культур і інш. важнейшых задач.

Створаны такім чынам усе магчымасьці для няўхільнага росту прамысловых тавараў, прадуктаў с.-г. вытворчасьці, для шырокага разгортваньня і паскарэньня тавараабароту, для разьвіцьця ўсіх форм і відаў савецкага гандлю.

XVII партыйная канфэрэнцыя ў сваіх пастановах падкрэсьліла **першаступовае значэньне разгортваньня** тавараабароту для забесьпячэньня «бальшавіцкіх тэмпаў узьдыму ўсяе на роднае гаспадаркі», паскарэньня росту сацыялістычнага накапленьня і па ліквідацыі снабжэньня працоўных прадуктамі і таварамі шырокага спажываньня.

Выключную ролю ў вырашэньні гэтай задачы павінна адыграць ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК аб збожжа і жывёлазагатоўках і калгасным гандлі, с.-г. прадуктамі.

«Савецкая ўлада,—гаворыцца ў пастанове,—атрымала **магчымасьць побач з мэтадам дзяржаўных збожжазагатовак практыкаваць, як сродак снабжэньня гарадзкога насельніцтва другі мэтад—мэтад гандлю збожжам самімі калгасамі і калгасьнікамі».**

Разгортваньне калгаснага гандлю зараз **дыктуецца інтарэсамі самой с.-г. вытворчасьці** і накіравана на ўздым таварнасьці, павышэньне гаспадарчай магутнасьці калгасу, на перавыхаваньне членаў арцеляй, зьнішчэньне «самаедзкіх» настрояў, дробна-ўласьніцкай псыхалёгіі і **ператварэньне калгасьнікаў у сапраўдных сацыялістычных работнікаў.**

У адпаведнасьці з апошнімі пастановамі ЦК і СНК,—ЦВК і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР у пастанове, апублікаванай гэтымі днямі, вызначылі канкрэтны парадак разгортваньня калгаснага гандлю, устанавілі цэлы рад ільгот для калгасаў, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, якія будуць рэалізоўваць лішкі сваёй прадукцыі.

Давядзеньне гэтай пастановы да кожнага калгасу, калгасьніка, бавая рэалізацыя яе зьвяжца новым магутным штурмом у разгортваньні калгаснай самадзейнасьці, у пасьпяховым сканчэньні веснавой сяўбы і бальшавіцкім правядзеньні ўборачнай кампаніі.

Разгортваньне калгаснага гандлю, бязумоўна, зьвязанага, з некаторымі труднасьцямі. На шляху ажыцьцяўленьня гэтай задачы трэба рашуча перамагаць супраціўленьне косных, апартуністычных элемэнтаў. І таму **асабліва нецярпімымі зьяўляюцца бла гадушныя настроі, стаўка на самацёк.** А такія настроі, такая стаўка існуе яшчэ сярод работнікаў некаторых арганізацый.

Хадзіць далёка за прыкладам такога парадку ня прыходзіцца. У матар'ялах аб нарадзе пры рэдакцыі «Зьвязды», якія надрукаваны ў сёнешнім нумары, прыводзяцца факты недапушчальнай цеганіны, бюракратычных адносін Белкаапсаюзу да будаўніцтва ларкоў на менскім рынку. **Каапэрацыйныя арганізацыі наогул ня ўключыліся яшчэ па-сапраўднаму ў барацьбу** за разгортваньне гандлю сельска-гаспадарчымі прадуктамі.

А між тым, перад каапэрацыяй, як гэта зусім правільна падкрэсьлівецца ў перадавой «Правды», паўстае **рад новых пытаньняў, новых задач.** Разгортваньне калгаснага гандлю ня толькі павінна сустрэць усямерную дапамогу з боку каапэрацыі, але прымусіць яе больш энэргічна працаваць, праяўляць большую паваротлівасьць, хутчэй перамагаць існуючыя і зараз у радзе яе зьвеньняў элемэнты косналасьці, пэпманекага духу і тэндэнцыі мэханічнага разьмеркаваньня тавараў.

Ад таго, як каапэрацыя будзе спраўляцца з гэтымі задачамі **не ў малой ступені залежыць узровень цэн на рынку, барацьба з перакупшчыкамі і спэкулянтамі.**

Факты косных адносін, апартуністычнага супраціўленьня разгортваньню калгаснага гандлю можна яшчэ сустрэць у радзе раённых калгасных, зямельных і нават партыйных арганізацый.

«Лявацкія» элемэнты, якія схільны не гандляваць, а разьмяркоўваць тавары, якія прапагандуюць пераход да простага прадуктаабмену і скасаваньня грошай ужо зараз, гэтыя «лявацкія» элемэнты, ігнаруючы задачу разгортваньня тавараабароту і мабілізацыі дадатковых рэсурсаў для рабочага снабжэньня, прабуюць таксама затармазіць разьвіцьцё калгаснага гандлю.

Мы ў БССР пакуль што маем надзвычай слабае разгортваньне калгаснага гандлю ў раёнах і прамысловых гарадох нашай рэспублікі. Мы ня маем яшчэ добра наладжанай работы калгаснага магазыну, мы можам налічыць менш дзесятка параўнаўча добра арганізаваных выездаў на рынак.

І нават пры такой зусім мізэрнай рабоце ўжо дапушчаны скажэньні пераважна «лявацкага» парадку.

Работнікі гомельскага ТСТ чыгуначнікаў і ЗРК «Бальшавік» (Менск), выходзячы з імкненьняў разьмяркоўваць, а не гандляваць, прабавалі замест дапамогі ў арганізацыі калгасных магазынаў зрабіць калгас простым пастаўшчыком прадуктаў, затушоўваючы яго ініцыятыву, ігнаруючы яго самастойнасьць.

Нельга ніяк дапускаць падобнага роду скажэньняў. Толькі поўнае захаваньне гаспадарчай самастойнасьці калгаснага магазыну, разьвіцьцё самадзейнасьці, захаваньне добраахвотнасьці ў выбары форм гандлю (магазын, ларок, рынак, воз і г. д.) будуць па-сапраўднаму спрыяць росту таварнасьці гаспадаркі і выкарыстаньню ўсіх магчымасьцяй, закладзеных у арцельнай стадыі калгасаў.

Разгарнуць па-сапраўднаму калгасны гандаль с.-г. прадуктамі—гэта значыць у першую чаргу растлумачыць кожнаму калгасьніку, кожнаму аднаасобніку — бедняку і сераняку тыя ільготы, тыя выгады, якія ён атрымлівае ад гандлю. Палітычную важнасьць гэтага боку справы трэба асмысліць ва ўсёй яе паўнаце.

Сход менскага гарадзкога партактыву па прапанове першага сакратара ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО пастанавіў правесьці масавы палітпаход рабочых у калгасы з мэтай растлумачэньня і рэалізацыі апошніх пастаноў партыі і ўраду. Менгаркомам прыняты меры, каб гэты паход быў праведзен у бліжэйшую пяцідзеньку. Прыкладу Менску абавязаны **пасьледаваць усе раённыя** і ў першую чаргу гарадзкія партарганізацыі.

І ў растлумачэньні і ў практычнай рабоце па разьвіцьці калгаснага гандлю патрэбен бальшавіцкі адпор усякім імкненьням няправільна па-апартуністычнаму тлумачыць пастановы ЦК, ЦВК і Савету Народных Камісараў Саюзу.

ЦВК і СНК скасавалі «ўсе існуючыя як рэспубліканскія, так і мясцовыя падаткі і зборы з гандлю калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобных працоўных сялян прадуктамі с.-г. вытворчасьці на базарах, пляцох, станцыях чыгунак, прыстанях (хлеб, мяса, птушка, яйкі, малочныя прадукты, гародніна, фрукты і г. д.)» і разам з гэтым вызвалілі ад абкладаньня с.-г. падаткам даходы калгасаў, калгасьнікаў ад гандлю, значна зьмяншыўшы гэты падатак для працоўных аднаасобнікаў.

Устаноўлена таксама, што **калгас, калгасьнікі і аднаасобнікі прадаюць сваю прадукцыю па цэнах, якія склад ваюцца на рынку.**

Гэтыя канкрэтныя ўмовы павінны ня толькі быць вядомы кожнаму калгасьніку і аднаасобніку, але ў практычнай рабоце **захоўвацца самым суровым чынам.**

Канкрэтныя рэзультаты гандлю с.-г. прадукцыі праявяцца тым больш хутчэй і паўней, чым больш дружна партыйныя, прафсаюзныя, калгасныя арганізацыі возьмуцца за справу, **чым шырэй будзе разьвіта масавая арганізатарская работа.**

Тут прыдзецца вырашыць цэлы рад, на першы погляд, як бы «дробных» пытаньняў. Будаўніцтва магазынаў, ларкоў, будаўніцтва складзкіх памяшканьняў і хавальняў (асабліва), аказаньне дапамогі ў рахункова-бухгальтарскай справе, арганізацыя транспарту, час выезду на рынак, у прыватнасьці, у нэрыяд палявых работ і цэлы рад іншых даволі важных спраў.

Уважлівасьць да ўсіх гэтых пытаньняў, **канкрэтнае** і неадкладнае іх вырашэньне зьяўляецца адной з важнейшых умоў пасьпяховага разгортваньня калгаснага гандлю і **барацьбы са спэкуляцыйнымі элемэнтамі,** якія «прабуюць пажыцца за кошт рабочых і сялян».

Рашуча змагаючыся з кулацтвам, перамагаючы правы апартунізм, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай данага нэрыяду і «левыя» загібы, **па-баявому ажыцьцёвім бальшавіцкія пастановы партыі і ўраду.**

ПЯЦІДЗЕНЬНІК ШТУРМУ ПЕРАТВАРЫЦЬ У МАСАВЫ ПАХОД ЗА ДАТЭРМІНОВАЕ СКАНЧЭНЬНЕ ПЛЯНАЎ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

БАЛЬШАВІЦКІ АДПОР „ЛЯВАЦКАЙ" НЕДААЦЭНЦЫ АДНААСОБНАГА СЭКТАРУ. ПРЫМУСІЦЬ КУЛАЦКА-ЗАМОЖНЫЯ ГАСПАДАРКІ ВЫКАНАЦЬ ЗАДАНЬНІ ПА СЯЎБЕ

ЧОРНАЯ ДОШКА

Ня гледзячы на шматлікія, катэгарычныя і выразныя дырэктывы ЦК КП(б)Б аб неабходнасьці мабілізацыі ўсіх партыйных сіл, усяго савецкага і прафсаюзнага апарату на ўмацненьне, канкрэтнае і аперацыйнае кіраўніцтва сяўбой у саўгасах, МТС, калгасах і арганізацыі сяўбы сярод бядняцка-сераняцкіх мас аднаасобнікаў, ход пасеўнай паказвае, што раёны, якія заносяцца на чорную дошку, да гэтага часу не прыступілі да практычнага ажыцьцяўленьня гэтых дырэктыў.

Заносім на чорную дошку за ганебныя тэмпы вядзеньня сяўбы 1 зусім недапушчальнае адставаньне па выкананьні важнейшай гаспадарча - палітычнай кампаніі.

Раёны па паўднёвай зоне

1) **Чачэрскі** — 7,4 проц. выкананьня пляну, 2) **Рэчыцкі** — 10,9 проц., 3) **Рагачоўскі** — 12,2 проц., 4) **Уваравіцкі** — 13,8 проц.

Раёны цэнтральнай зоны

1) **Шклоўскі** — 1,4 проц., 2) **Талачынскі** — 5,8 проц., 3) **Бялыніцкі** — 6,5 проц., 4) **Касьцюковіцкі** — 8,1 проц., 5) **Чавускі** — 8,8, 6) **Прапойскі** — 9,3 проц.

Раёны паўночнай зоны

1) **Сураскі** — 3,4 проц., 2) **Сеньненскі** — 5 проц., 3) **Гарадоцкі** — 6,6 проц., 4) **Полацкі** — 8,3 проц.

Асабліва адзначаем ганебнае адставаньне буйнейшых пралетарскіх цэнтраў, якія маюць вялікія магчымасьці, значныя партактыў, шматтысячныя партарганізацыі, шырокую сетку шэфскіх арганізацый, якія ня гледзячы на гэта, маюць выкананьне пляну сяўбы значна ніжэй рэспубліканскага і занальнага процанту выкананьня пляну.

Заносім на чорную дошку:

1) **Гомельскі** — 14,5 проц. (паўднёвая зона),
2) **Менскі** — 14,1 проц. (цэнтральная зона).
3) **Віцебскі** — 5,3 проц. (паўночная зона).

Кандыдаты:

Рад раёнаў, апрача занесеных намі на чорную дошку (**Бабруйскі, Нараўлянскі, Камарынскі, Бярэзінскі, Магілеўскі, Чэрыкаўскі, Бягомльскі, Горацкі, Крупскі, Дрысенскі, Расонскі, Сіроцінскі,** таксама вядуць сяўбу яўна нездавальняючымі тэмпамі. Гэтыя раёны, як і ўсе іншыя, павінны ў бліжэйшую пяцідзеньку ліквідаваць адставаньне, зламаўшы супраціўленьне кулацтва і яго агентуры — апартуністаў, і сапраўды бальшавіцкімі тэмпамі разгарнуць трэцюю бальшавіцкую сяўбу.

Зводка НКЗБ

аб ходзе сяўбы па раёнах БССР на 20 мая 1932 году

НАЗВА РАЕНАЎ	Агульны проц. выканан.	Процант выкананьня пляну па культурах: Лён	Бульба
ПАЎДНЁВАЯ ЗОНА			
1. Жыткавіцкі	75,6	85,0	91,6
2. Старобінскі	51,5	50,2	66,4
3. Глускі	49,3	54,1	52,9
4. Тураўскі	48,0	48,0	50,5
5. Парыцкі	45,3	43,2	40,6
6. Хойніцкі	35,8	34,6	29,1
7. Брагінскі	34,6	27,9	24,5
8. Любанскі	34,3	47,8	41,7
9. Лельчыцкі	33,0	4,3	38,1
10. Ельскі	30,9	42,6	33,8
11. Мазырскі	29,5	39,3	24,8
12. Пятрыкаўскі	28,1	46,2	40,3
13. Б.-Кашалёўскі	26,9	28,1	26,6
14. Лоеўскі	25,9	29,7	33,0
15. Карэльскі	25,4	6,9	26,2
16. Жлобінскі	25,3	19,2	24,9
17. Церахаўскі	23,7	16,8	17,1
18. Веткаўскі	23,0	16,9	21,1
19. Камарынскі	19,7	11,5	16,5
20. Нараўлянскі	15,7	18,1	17,5
21. Бабруйскі	15,2	—	17,5
22. Гомельскі	14,5	5,0	15,5
23. Уваравіцкі	13,8	8,7	8,7
24. Рагачоўскі	12,2	8,5	12,3
25. Рэчыцкі	10,9	6,1	9,2
26. Чачэрскі	7,4	5,9	4,4
Усяго па зоне	26,1	21,1	26,5
ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА			
1. Ч.-Слабодзкі	56,1	61,9	68,8
2. Вузьдзенскі	43,5	6,2	39,9
3. Быхаўскі	43,1	—	23,7
4. Капыльскі	39,6	4,5	24,5
5. Слуцкі	37,5	14,9	40,8
6. Чэрвеньскі	36,7	9,5	38,7
7. Лагойскі	30,2	4,5	35,5
8. Клічаўскі	29,9	10,4	28,5
9. Пухавіцкі	29,5	16,4	25,9
10. Клімавіцкі	28,6	10,0	32,9
11. Мсьціслаўскі	23,9	19,2	15,6
12. Асіпавіцкі	22,2	8,9	26,2
13. Крычаўскі	21,6	8,8	15,8
14. Ст.-Дарожскі	20,8	9,5	20,4
15. Барысаўскі	20,7	1,9	32,2
16. Заслаўскі	19,6	0,9	23,7
17. Смалявіцкі	18,0	8,2	21,4
18. Чырвонапольскі	16,9	9,8	15,9
19. Койданаўскі	15,4	—	14,0
20. Пленчаніцкі	15,8	—	22,4
21. Крупскі	14,1	1,4	26,5
22. Менскі	14,1	1,7	15,7
23. Горацкі	13,9	4,1	11,9
24. Бягомльскі	13,2	—	15,7
25. Чэрыкаўскі	11,6	9,6	4,1
26. Магілеўскі	11,6	1,7	12,0
27. Бярэзінскі	11,0	6,0	11,7
28. Прапойскі	9,3	0,5	2,8
29. Чаўускі	8,8	0,6	9,8
30. Касьцюковіцкі	8,1	—	1,4
31. Бялыніцкі	6,5	0,3	5,2
32. Талачынскі	5,8	2,9	5,9
33. Шклоўскі	1,4	0,3	2,3
Усяго па зоне	16,4	5,2	19,6
ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА			
1. Бешанковіцкі	14,4	0,9	4,5
2. Асьвейскі	13,9	7,6	11,3
3. Лёзьнянскі	12,6	13,2	4,6
4. Арэшанскі	11,6	8,4	10,6
5. Вушацкі	10,5	6,1	10,6
6. Дуброўенскі	10,5	2,9	9,5
7. Лепельскі	10,5	3,9	11,1
8. Чашніцкі	10,3	4,2	8,6
9. Сіроцінскі	9,3	2,2	15,2
10. Расонскі	8,5	1,7	11,2
11. Дрысенскі	6,4	6,8	5,7
12. Полацкі	6,3	3,5	7,4
13. Гарадоцкі	6,6	6,1	6,3
14. Віцебскі	5,3	—	4,4
15. Сеньненскі	5,0	3,9	4,4
16. Сураскі	3,4	1,3	3,1
Усяго па зоне	8,7	4,5	8,1
Усяго па БССР	18,3	7,1	19,6

УВАГА: Зводка складзена па даных на 20 мая з 65 раёнаў. З трох раёнаў уключаны даныя па 15-га мая, якія не ўвайшлі ў папярэднюю зводку, а па астатніх уключаны даныя з папярэдніх пяцідзевак.

Кіраўнік пасеўбюро НКЗБ
ТАРАСЕВІЧ.

Ніжэй узроўню мінулага году

ВІЦЕБСК. (Наш кар.) Атрыманыя весткі на 20 мая гавораць аб яўна нездавальняючым ходзе сяўбы ў калгасах і аднаасобным сэктары. Паводле пляну, у Віцебскім раёне сёлета павінна быць засеяна 35.607 га розных культур. На 20 мая калгасамі замест 26.892 га паводле пляну засеяна ўсяго 1.387 га, або 5,12 проц. і аднаасобным сэктарам замест 8.715 га — 580 (6,6 проц.).

Сяўба ідзе нават ніжэй узроўню **мінулага году.** У мінулым годзе, калі ў раёне налічвалася 12 сельсаветаў (зараз Віцебскі раён яднае 15 сельсаветаў), на 20 мая было засеяна 2.854 га, г. зн. на 886 га больш чым у гэтым годзе. Асабліва нездавальняюча раён спраўляецца з сяўбой **асноўных культур** — бульбы і гародніны. На 20 мая плян сяўбы бульбы выканан усяго на 3,38 проц. і гародніны — на 1 проц., у той час, як плян сяўбы бульбы на 20 мая трэба было выканаць на ўсе 100 проц.

Прычыны такога адставаньня хаваюцца, галоўным чынам, у яшчэ дрэннай арганізацыі працы калгасьнікаў, прыкладам чаму можа служыць Віцебскі сельсавет, дзе ў большасьці старшыні калгасаў замяняюць работу брыгадзіраў. Апошнія фактычна абязьлічаны. Брыгадзіры не адчуваюць адказнасьці за работу сваіх брыгад. **МТС,** якая абслугоўвае 5 сельсаветаў, яднае 36 калгасаў, яшчэ **не пераключылася** на баявыя тэмпы работы. Амаль ні адзін трактар ня выконвае вызначаных нормы.

Гарсавет, райкалгассаюз павінны ўжыць самыя рашучыя меры да фарсаваньня ходу сяўбы, поўнага выкананьня пасеўных плянаў.

На станцыі Смалявічы валяюцца пасеўныя грузы

СМАЛЯВІЧЫ. На станцыі **Смалявічы** пакгаузы і павеці — перапоўнены жытам, бульбай, просам, кукурузай і рознымі с.-г. машынамі, якія прызначаны саўгасам для правядзеньня пасеўнай кампаніі.

Каля 15 вагонаў кукурузы і шмат с.-г. машын з-за адсутнасьці месца пад павецямі знаходзяцца пад адкрытым небам і псуюцца. Як збожжа, так і розныя машыны на станцыі валяюцца больш чым па месяцу і нікім не ахоўваюцца. Жыта, кукуруза і інш. прадукты раскрадаюцца. Гэта ў той час, калі палі чакаюць машын і насеньня, а рабочыя саўгасаў—хлеба.

Кіраўнікі саўгасаў ня прымаюць ніякіх захадаў да свайчасовай дастаўкі гэтых грузаў на месца. Як працаўнікі смалявіцкага РК КП(б)Б, РВК, РКК-РСІ, так і пракуратура аб гэтым добра ведаюць, але на такое ганебнае зьявішча не рэагуюць.

Органы ЦКК-РСІ павінны заняцца высьвятленьнем справы і прыцягнуць да суровай адказнасьці канкрэтных вінаватых, якія тармозяць выкананьне пасеўных плянаў.

А.

ЧЫРВОНЫ СЬПІС

кандыдатаў на прэміяваньне за лепшае і хутчэйшае правядзеньне сяўбы

Заносім у чырвоны сьпіс наступныя раёны:

1) **Жыткавіцкі.**
2) **Чырвона - Слабодзкі.**
3) **Старобінскі.**

Кандыдаты:

Глускі—49,3 проц., **Тураўскі** — 48 проц., **Парыцкі** — 45,3 проц., **Вузьдзенскі** — 43,5 проц., **Быхаўскі** — 43,1 проц. Гэтыя раёны і ўсе іншыя маюць усе магчымасьці, каб у бліжэйшыя дні зрабіць круты ўздым і стаць у рады перадавікоў і кандыдатаў на прэміяваньне.

ЧЭРВЕНЬ, 23. (Па тэлефону).

Саўгас **«Маладая гвардыя»**, на аснове ажыцьцяўленьня 6 умоў тав. Сталіна, разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва, 23 мая поўнасьцю скончыў сяўбу яравых. Засеяна ў саўгасе 624 га. Акрамя поўнага выкананьня пляну саўгас высунуў сутрэчны і ўжо засеяў аўса 20 га, сэрадэлы 7 га. кармовых траў 76 га і бульбы 12 га. Засеяна ў фонд абароны 2 га аўса.

Саўгас пераключыўся на дапамогу ў веснавой сяўбе калгасу «Чырвоны гарадок».

ЕРМАЛОВІЧ І КАСОЎСКІ.

***

ЛЁЗНА. (Па тэлеграфу). Саўгас Крынкі першым у раёне 22 мая скончыў сяўбу яравых. Засеяна 187 гектараў.

***

ЦЕРАХОЎКА. (Па тэлеграфу). Калгас імя Варашылава, Ленінскага сельсавету, у адказ на апошнія пастановы партыі і ўраду датэрмінова скончыў сяўбу збожжавых з перавыкананьнем пляну па аўсе на 20 га, па ячмені на 3 га, па пшаніцы на 8 га, па каню шыне на 5 га. Усе іншыя культуры будуць засеяны да 25 мая.

Лявоненка.

Хроніка конкурсу

АСЬВЕЯ. (Па тэлеграфу). Раён уключыўся ва ўсебеларускі конкурс на лепшае і хутчэйшае правядзеньне веснавой сяўбы.

АДАМЕНКА.

***

УВАРАВІЧЫ. (Па тэлеграфу). Калгас імя Будзённага ўключыўся ва ўсебеларускі конкурс на лепшае і хутчэйшае правядзеньне веснавой сяўбы і абавязаўся закончыць сяўбу да 1-га чэрвеня.

ГАЎРУКОВІЧ.

***

ГЛУСК. (Па тэлеграфу). Саўгас Завалочыцы ўключыўся ва ўсебеларускі конкурс на хутчэйшае сканчэньне веснавой сяўбы. Умовы конкурсу дэтальна распрацаваны на зьлёце брыгадзіраў.

Трыкутнік саўгасу.

Спачуваюць, разважаюць, канстатуюць...

ГОМЕЛЬ Наш кар.).

Гомельскі прыгарадны раён са сваёй разгорнутай сеткай саўгасаў ЗРК і сельгаскамбінатам мае выключна значэньне ў справе забесьпячэньня сьнежкай гарадзкой рабочых Гомелю, як аднаго з буйнейшых прамысловых цэнтраў БССР.

Прыгарадныя гаспадаркі павінны засеяць у трэцюю бальшавіцкую сяўбу больш, як **5.000 га.** На сёнешні дзень тэмпы сяўбы надзвычай марудныя. На 15 мая агульны плян сяўбы выкананы толькі **на 25 проц.**

Прычыны такога ганебнага становішча тлумачацца тым, што галоўная стаўка на самацёк, адсутнічае аперацыйнае кіраўніцтва пасеўнай кампаніяй з боку яднага раду раёнарганізацый. Характэрна, што да 10 мая ні адна з арганізацый г. Гомелю сказат ня мела ніякіх весткак аб ходзе сяўбы.

У выніку апартуністычнай недасьцяжкі прыгарадных гаспадарак, адсутнасьці штодзённага аперацыйнага кіраўніцтва з боку зямельных і каапэрацыйных арганізацый — яшчэ і па сёнешні дзень па большасьці гаспадарак **ня ўзяты бальшавіцкія тэмпы** ў разгортваньні сяўбы. Прыгарадная гаспадарка заводу імя Ланцуцкага нават ня мае каляндарнага пляну работ, адсутнічаюць нормы выпрацоўкі, не хапае на насеньне 52 тоны бульбы, 800 кгр. цыбулі, не забясьпечана кормам цягавая сіла.

Гомельская МТС не аказвае дапамогі прыгарадным гаспадаркам. Дырэкцыя яшчэ не ажыцьвіла з гаспадаркамі дагавораў. Частка трактараў МТС шрэдкімі тыднямі стаіць без работы з-за адсутнасьці плугоў. Гэтыя плугі ёсьць у Гомельгаскамбінаце і ў іншых калгасах, але кіраўніцтва МТС катэгарычна адмаўляецца даваць трактары.

Гарпрафсавет, гарсаз, гарсавет і іншыя арганізацыі заняст штодзённай канкрэтнай, рэальнай дапамогі прыгарадным гаспадаркам у арганізацыі сяўбы, займаюцца толькі спачуваньнямі, разважаньнямі, заслухоўваньнем справаздач і канстатаваньнем тлумачных марудных тэмпаў у правядзеньні пасеўнай кампаніі.

Гарпрафсавет не забясьпечыў выезд людзей, якія мабілізаваны для практычнага ўдзелу ў сяўбе. Гарадзкі транспарт ня кінуты на дапамогу прыгарадным гаспадаркам, на сёнешні дзень яшчэ ня вывезена каля 7.000 тон гною.

Саюзтранс ужо на працягу 5 дзён марудзіць з заключэньнем дагавору на разгрузку з Гомельскай станцыі мінэральнага ўгнаеньня, насеннага і кармовага матар'ялу для прыгарадных гаспадарак. Зараз на станцыі для сельгаскамбінату ляжаць 11 вагонаў не перавезенага мінэральнага ўгнаеньня і 38 тон аўса. З Новабеліцы трэба перавезьці 75 тон сена, з Урочыча «Чырвоны маяк» — 40 тон бульбы і г. д.

Неабходна ў бліжэйшыя дні дабіцца рашучага пералому ў справе выкананьня і перавыкананьня пасеўных плянаў прыгарадных гспадарак. Канкрэтным посьбітам апартуністычнай стаўкі на самацёк трэба даць руйнуючы бальшавіцкі адпор.

МТС ігнаруюць радавы пасеў ільну

Вядома, што радавы пасеў ільну цалкам апраўдаў сябе. Усе дасьледчыя ўстановы на ўсесаюзным зьезьдзе па павышэньні ўраджайнасьці ільну, які адбыўся ў Маскве ў студзені 1932 году, аднагалосна заявілі аб выгаднасьці і неабходнасьці засеву ільну радавым пасевам. Урадавыя органы выразна падкрэсьлілі неабходнасьць пашырэньня радавога пасеву ільну, як мерапрыемства, якое значна павышае ўраджайнасьць тэхкультур. Калгасы, якія ўжо некалькі год праводзілі радавы пасеў, даюць самую лепшую ацэнку гэтаму мерапрыемству.

На жаль, гэтай справе ня ўсюды аддаецца належная ўвага. Некаторыя ільнаводчыя МТС, якія павінны быць застрэльшчыкамі ўкараненьня тэхнікі ў калгасах, нічога ня робяць. Сяўбу ільну пачалі рукамі, а не сяваркамі. Як ня дзіва, але ільнодная МТС не праводзіць радавога пасеву ільну.

Яшчэ ня позна пераключыцца на радавы пасеў, трэба скарыстаць усе наяўныя радавыя сяваркі шляхам збліжэньня сашнікоў да 7-мі сант. і выверкі на высеў ільну. Там, дзе ёсьць 40-радовыя спэцыяльныя ільнаводныя сяваркі, іх трэба поўнасьцю скарыстаць.

Вядучыя ільнаводчыя раёны — Лёзна, Шклоў, Сураж, Сіроцінка, Гарадок і інш. — павінны шырока распачаць радавы пасеў, а МТС гэтых раёнаў павінны быць сапраўднымі пачынальнікамі правядзеньня гэтага важнейшага агратэхнічнага мерапрыемства па ўздыме ўраджайнасьці тэхнічных культур.

Аграном **БУДАЙ.**

Пад суд за затрыманьне і псаваньне насеньня бульбы

ГОМЕЛЬ, 20. (Па тэлефону).

У саўгасе **«Ачосарудня»**, Веткаўскага раёну, ляжыць каля 4 тысяч пудоў насеннай бульбы. Ня гледзячы на гэта, дырэктар саўгасу Трацько ўпарта ігнаруе выкананьне распараджэньня сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Рыскіна,** які зараз знаходзіцца ў Гомелі, і сакратара РК КП(б)Б т. **Клюткі** аб адгрузцы 210 тон насеннай бульбы па нараду Насентрэсту для гомельскага і барысаўскага саўгаскамбінатаў, а таксама для саўгасаў «Вольная праца», «Чырвоны маяк» і «Зялёны луг», Менскага раёну.

Адказны выканаўца Белкаапсаюзу тав. Крэмэр з 6 па 20 мая ня змог дабіцца адгрузкі бульбы. Бульба зараз гніе і вартаўнікі крадуць яе і прадаюць мясцовым сялянам. Дырэктар аб гэтым ведае і ніякіх захадаў ня ўжывае. Больш таго. У Трацько нават хапае нахабнасьці пісаць у Веткаўскі РК КП(б)Б аб тым, што «бульба ўжо ўся здана па актах і больш няма», у той час, як яна разбазараецца і скармліваецца жывёле.

Неабходна дырэктара саўгасу Трацько прыцягнуць да судовай крымінальнай адказнасьці і адгрузіць насенную бульбу па нарадах.

УСЮ РАБОТУ ПА МЕСЯЧНІКУ ДРУКУ ПАДНАЧАЛІЦЬ БАРАЦЬБЕ ЗА СЯЎБУ

(Усім ГК і РК КП(б)Б, старшыням КК-РСІ, рэдактарам газэт)

Па пастанове ЦК і ЦКК КП(б)Б на БССР з 16 красавіка па 16 мая праводзіўся месячнік масавай праверкі ажыцьцяўленьня пастаноў партыі па выкананьні рабсельскораўскага руху, нізавога друку і падрыхтоўкі газэтных кадраў.

Пракануем вынікі правядзеньня масавай праверкі падагуліць на аб'яднаньным пасяджэньні бюро РК і прэзыдыуму РВК з апублікаваньнем у друку канкрэтных мерапрыемстваў па забесьпячэньні няўхільнага ажыцьцяўленьня партыйных пастаноў аб рабсельскораўскім руху, нізавым друку і падрыхтоўцы газэтных кадраў.

ЦК і ЦКК КП(б)Б канстатуюць, што з боку пасасобных райкомаў партыі і раённых кантрольных камісій (Лагойск, Пярлыны, Прапойск) ёсьць фактычнае ігнараваньне спэцыяльнай пастановы XIV усебеларускага зьезду КП(б)Б аб тым, што «работа па ўзмацненьні сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабсельскораўскім зьяўляецца **АДНЫМ З АДКАЗНЕЙШЫХ ВУЧАСТКАЎ АГУЛЬНА-ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ».**

У сувязі з яўна нездавальняючым разгортваньнем работы па месячніку ЦК і ЦКК лічаць неабходным у наступных раёнах прыцягнуць месячнік да 20 чэрвеня: **Бярэзіна, Вузда, Горкі, Камарына, Любань, Парычы, Чышчанольле, Бягомль, Брагін, Капыль, Лагойск, Плешчаніцы, Прапойск, Чашнікі, Ельск, Лельчыцы, Пятрыкаў, Пухавічы, Сіроціна, Стар

Партыйнае будаўніцтва

ВЫШЭЙ РОЛЮ ПАРТЫЙНЫХ ГРУП Ў РАЗГОРТВАНЬНІ УНУТРЫПАРТЫЙНАЙ І МАСАВАЙ РАБОТЫ НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ

За правільную пастаноўку работы ў нізавых зьвеньнях

У чэрвені месяцы па пастанове Цэнтральнага Камітэту **КП(б)Б склікаецца** ўсебеларуская канфэрэнцыя групарторгаў. У вытворчых партарганізацыях у сувязі з гэтым зараз разгорнута значная работа па агляду дзейнасьці нізавых партыйных зьвеньняў на прадпрыемствах. Папярэднія даныя агляду паказваюць, што на радзе буйнейшых прадпрыемстваў партыйныя групы дабіліся вялікіх посьпехаў, асабліва ў барацьбе за высокія вытворчыя паказальнікі. Напрыклад, партыйная група брыгады абрубшчыкаў на гомельскім Сельмашы ўвяла зьменна-сустрэчнае пляпаваньне, забясьпечыла выкананьне прамфінпляну першага кварталу на 108,6 проц. Партыйная група брыгады імя Молатава (друкарня імя Сталіна, Менск) сваёй баявой работай забясьпечыла выкананьне прамфінпляну за першы квартал на 118 проц. У красавіку гэта брыгада дала яшчэ больш высокія паказальнікі работ—прамфінплян выканан на 134 проц. На Віцебскім «Чырвоным кэталісьце» брыгада фармоўшчыкаў кариярэзак у красавіку забясьпечыла выкананьне вытворчага заданьня на 102 проц.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што партгрупы на прадпрыемствах, разгортваючы барацьбу за 6 умоў тав. Сталіна, узьнімаючы на вышэйшую ступень сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, павышаючы авангардную ролю камуністаў на вытворчасьці, праявілі сябе, як сапраўдныя арганізатары мас за выкананьне вытворчай праграмы чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

Але разам з гэтым трэба проста сказаць, што значная колькасьць партыйных груп вельмі слаба разгортвае ўнутрыпартыйную работу і асабліва ў напрамку палітычна-клясавага выхаваньня шырокіх рабочых мас. Цэлы рад партыйных груп, нават тых, якія праявілі сябе здольнымі арганізатарамі барацьбы за прамфінплян, усё яшчэ невыстарчальна ставяць на практычнае вырашэньне пытаньні ўнутрыпартыйнай і палітычна-масавай работы. Яркі прыклад гэтаму некаторыя партколектывы гор. Барысава.

Зараз, напярэдадні ўсебеларускай канфэрэнцыі групарторгаў кожная цэхавая, зьменная ячэйка, кожны парткалектыў павінны шырока паставіць пытаньне аб разгортваньні ўнутрыпартыйнай, палітычна - масавай работы ў нізавых вытворчых зьвеньнях. Трэба дабіцца такога становішча, каб кожная партыйная група побач з вырашэньнем вытворчых пытаньняў шырока разьвіла работу агітацыйна-прапагандысцкага характару.

Адна з галоўных задач партыйнай групы—штодзенная прапаганда генэральнай лініі партыі ў рабочых масах, давядзеньне да мас асноўных пастаноў партыі і ўраду. ЦК УсеКП(б) і СНК вынесьлі пастановы аб разьвіцьці калгаснага гандлю. Трэба, каб гэтыя пастановы, якія маюць вялікі палітычны зьмест, былі даведзены да шырокіх рабочых мас. Кожны рабочы павінен добра разумець, што поўная рэалізацыя гэтых пастаноў партыі і ўраду «за бясьпечнае яшчэ больш шпаркае разьвіцьцё калгаснай вытворчасьці, далейшае паляпшэньце матар'яльна-бытавых умоў рабочай клясы і шырокіх мас калгасьнікаў.

Зусім ясна, што мэтады ўсёй палітычна-масавай работы ў нізавых вытворчых зьвеньнях павінны быць дыфэрэнцыяваны прыстасоўна да ўзроўню тэй ці іншай групы рабочых.

Зараз у час агляду дзейнасьці нізавых партыйных зьвеньняў трэба максымум увагі зьвярнуць на тое, як партыйныя групы побач з арганізацыяй барацьбы за выкананьне прамфінпляну разгортваюць унутрыпартыйную і палітычна-масавую работу. Праверыць наколькі глыбокі яе ідэйна - палітычны зьмест, наколькі гэты зьмест адлюстроўвае асноўныя дырэктывы нашай партыі.

Рыхтуемся да ўсебеларускай канфэрэнцыі

Ва ўсіх нізавых вытворчых зьвеньнях друкарні імя **Сталіна** арганізаваны партыйныя групы. З часу арганізацыі партгруп, цэнтр цяжару партыйна-масавай работы на гэтым прадпрыемстве сканцэнтрован у брыгадзе. Правільная расстаноўка партсіл па вытворчасьці, шырокае разгортваньне партыйна-масавай работы па мабілізацыі рабочых на пасыляховае выкананьне прамфінпляну, увязка гэтай работы з папулярызацыяй асноўных задач партыі на сацыялістычным будаўніцтве забясьпечыла значнае павышэньне прадукцыйнасьці працы.

У тых нізавых вытворчых зьвеньнях, дзе правільна пастаўлена работа партгруп, дзе па-бальшавіцку вядзец ца барацьба за рэалізацыю 6 умоў тав. Сталіна, прамфінплян выконваецца са значным перавышэньнем як па колькасных, так і якасных паказальніках.

У гэтай справе значных посьпехаў дабілася партгрупа брыгады імя **Молатава, якая па выкананьні прамфінпляну зьяўляецца перадавой ва ўсім наборным цэху.** Гэта брыгада за першы квартал выканала прамфінплян на 118,7 проц. У красавіку брыгада дала яшчэ больш паказальныя рэзультаты, выканаўшы прамфінплян на 134 проц. Добрыя паказальнікі вытворчай работы за першы квартал далі і рад іншых брыгад. Брыгада імя **XIII Кастрычніка перавыканала** прамфінплян за першы квартал на 12 проц., за красавік—на 18 проц. Брыгада імя **Леніна** таксама дала 10,1 проц. **перавыкананьня** прамфінпляну за першы квартал. Брыгада імя **МОПР'у** (пераплётны цэх) выканала сваё вытворчае заданьне за красавік месяц на 113 проц.

Перавыкананьне прамфінпляну дасягнута дзякуючы канкрэтна-апэрацыйнаму партыкіраўніцтву работай у нізавых зьвеньнях, дзякуючы перабудове работы ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі.

Зараз шырока разгорнута падрыхтоўчая работа да надыходзячай усебеларускай канфэрэнцыі груп парторгаў. Праведзена парада групарторгаў і партарганізатараў па гэтым пытаньні.

Уся падрыхтоўчая работа да ўсебеларускай канфэрэнцыі групарторгаў праходзіць пад знакам завяршэньня перабудовы партыйна-масавай работы, пад знакам замацаваньня і разьвіцьця далейшых посьпехаў у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

М. Сакалоўскі, Рубінштэйн.

У ліку перадавых

Партыйны калектыў **Гомсельмашу** перабудаваў сваю работу ў адпаведнасьці з пастановай ЦК УсеКП(б) ад 21 сакавіка 1931 году аб партыйна-масавай рабоце ў цэху і брыгадзе. Кіраўніцтва парткалектыву аддало вялікую ўвагу арганізацыі і ўмацаваньню нізавых партзьвеньняў на прадпрыемстве. Зараз на заводзе налічваецца 36 партгруп і 16 партарганізатараў.

У прыклад другім можна прывесьці, як паказальную па сваёй пастаноўцы работы, **партгрупу брыгады абрубшчыкаў** чыгуна - ліцейнага цэху, якая ўзначальваецца групарторгам тав. **Собалем.** Партгрупа складаецца з 10 членаў і кандыдатаў партыі. Апрача таго, што кожны партыец выконвае пэўную нагрузку па партыйнай і грамадзкай рабоце, групарторгам даюцца пэрыядычныя заданьні. Партгрупа дэтальна прапрацоўвае ўсе асноўныя дырэктывы партыі і сваячасова даводзіць іх да рабочых мас.

У рэзультаце сыстэматычнай унутрыпартыйнай выхаваўчай работы, ка муністы ў брыгадзе сапраўды адыгрываюць авангардную ролю, падаюць прыклады бальшавіцкага змаганьня за прамфінплян. Ня толькі партыйцы, але і ўсе беспартыйныя рабочыя пагалоўна ахоплены сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. **Зьменна-сустрэчнае пляпаваньне ў брыгадзе зьяўляецца штодзенным мэтадам работы.** Праўда, пасобныя рабочыя не заўсёды выконваюць узятыя на сябе абавязкі ў паменшэньні ліку прагулаў бяз уважлівых прычын. Партыйная група рэагуе на гэтыя зьявішчы шляхам грамадзкай узьдзейнасьці.

У аснову работы партгрупы па мабілізацыі рабочых на выкананьне прамфінпляну пакладзена рэалізацыя 6 умоў тав. Сталіна.

Важнае ў рабоце партгрупы—гэта пляпавасьць, апэрацыйнасьць і дакладны ўлік работы, сыстэматычная праверка выкананьня даручанай работы таму ці іншаму партыйцу.

У рэзультаце такой пастаноўкі работы прамфінплян у брыгадзе абрубшчыкаў з месяца ў месяц перавыконваецца. Прамфінплян за першы квартал г. г. выканан на 108,6 проц., брак зьніжан да 0,4 проц. Трэба адзначыць, што **перавыкананьне прамфінпляну па колькасных і якасных паказальніках дасягнута пры наяўнасьці 41 рабочага ў брыгадзе, замест 50, прадугледжаных плянам.**

Вялікую ўвагу аддала партгрупа справе марксыцка-ленінскага выхаваньня. Апрача партыйцаў, увесь яімовы пэрыяд наведвалі АПШ 26 беспартыйных рабочых. 4 рабочых вучацца на рабфаку. Значная колькасьць рабочых рэгулярна наведвае заняткі гурткоў вайсковых ведаў. Такім чынам, рабочыя спалучаюць сваю штодзенную працу з задачамі ваянізацыі і ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны.

Н. Гафт.

Агляд друку

Узор пастаноўкі абарончай работы („Палеская праўда"--орган Гомельскага гаркому КП(б)Б)

«Палеская праўда» для многіх нашых газэт можа зьвіцца ўзорам таго, як трэба ставіць пытаньні абарончай работы, як трэба мабілізаваць масы працоўных вакол задач абароны краіны.

Па ініцыятыве органу Рэвваенсавету Саюзу — «Красной звезды» праводзіцца агляд выкарыстоўваньня тэхнічных сродкаў палітработы. Гомельская газэта «Палеская праўда» не стаіць у баку ад гэтага агляду.

«Радыё ў казарме прад'яўляе нам іск. Аддзяленьне сувязі выкрэсьліла радыёработу ў часьцях са сьпіскаў сваёй штодзённай работы» («П. П.» ад 5 сакавіка).

Так газэта сыгналізуе аб дрэнным становішчы ў выкарыстоўваньні тэхнічных сродкаў палітработы.

У Гомель прыяжджае брыгада Пуокра на чале з членам РВС тав. Аранштамам для абсьледваньня становішча агітацыі і палітычнай масавай работы ў часьцях дывізіі. Газэта ўключаецца ў гэта абсьледваньне. Яна вылучае нават свайго прадстаўніка ў выязную рэдакцыю Пуокра. Яна мабілізуе рабочых гораду на ўдзел у гэтым абсьледваньні, паказвае ім тыя задачы, якія яны павінны выканаць.

«Рабочыя гораду, прадпрыемствы-шэфы і падшэфныя вайсковыя часьці павінны ператварыць прыезд камісіі Пуокра ў фактар разгортваньня абарончай работы ў горадзе. Шэфства над вайсковымі часьцямі, сувязь вайсковых часьцей са сваімі шэфамі-прадпрыемствамі яшчэ ня сталі прыкладнымі.

Мы абавязаны: арганізаваць масавую праверку становішча шэфскай работы, дабіцца таго, каб вайсковыя часьці сталі актыўнымі ваяізатарамі свайго шэфа-прадпрыемстваў» («П. П.» ад 14 красавіка).

Распаўсюджаньне білетаў 6-й лётарэі Асоавіяхіму — ударная кампанія па мабілізацыі мас на дапамогу абароне. Газэта хутка ўключаецца ў гэту кампанію. Яна апэрацыйна змагаецца за выкананьне кантрольных заданьняў распаўсюджваньня білетаў па Гомелі і раёне пад лёзунгам: «узмацняйце фінансавую базу абароны».

Газэта правільна зьвязвае падзеі на Далёкім Усходзе з чарговымі задачамі працоўных.

«Вайна на Далёкім Усходзе пагражае новай сусьветнай вайной, і ў першую чаргу — супроць Савецкага саюзу... Ні аднаго рабочага бяз білету лётарэі Асоавіяхіму. Апрача таго, бяром па сябе абавязацельствы выканаць прамфінплян першага кварталу не пазьней 25 сакавіка.

У першы выходны дзень адпрацоўваем чатыры гадзіны на карысьць тэхнічнага аснашчэньня Асобай Далёкаўсходняй («П. П.» ад 14 красавіка).

«Палеская праўда» выпускае пацыянальную старонку на яўрэйскай мове і ў гэтай старонцы адлюстроўваюцца пытаньні абароны. Да прыкладу, разгортваецца кампанія па збор сродкаў для пабудовы танку імя Біра-Біджану.

Набліжаецца прызыў 1910 г.—баявая масава-палітычная кампанія. У некаторых зьвеньнях савецкіх органаў недаацэньваюць значэньня гэтай работы, ня ўжываюць выстарчальных мер для падрыхтоўкі папаўненьняў радоў Чырвонай арміі. «Прызыўнікі пачакаюць» — гавораць у АНА і перанясьць ліквідацыю няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў на восень. «Палеская праўда» высоўвае канкрэтныя задачы па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў да іх уходу ў армію.

1 ў перадавой «П. П.» напамінае аб падрыхтоўцы да прызыву.

«Даць Чырвонай арміі маладога, клясава-праверанае, здаровае, пісьменнае і ваенна-навучанае папаўненьне, — вось агульная задача. Зразумела, яна павінна быць вырашана ва ўсіх дэталях. Але гэта задача падзяляецца, і тут у кожнай установе і арганізацыі дасцца свая асобная задача і г. д.».

Апошні пленум Цэнтральнага Савету Асоавіяхіму СССР адзначыў новае здавальняючае кіраўніцтва ва многіх зьвеньнях арганізацыі, слабасьць работы.

«П. П.» змагаецца за перабудову работы Асоавіяхіму, за разгортваньне самакрытыкі ў яго радох, за ўцягненьне шырокіх мас працоўных у работу Асоавіяхіму, гэтага шматмільённага рэзэрву Чырвонай арміі. Газэта не ўпадае ў перагіб. Яна адзначае вялікую цягу мас да абарончай работы, вялікія дасягненьні ў справе ўцягненьня мас у гэту работу.

«На 1932 г. ячэйкамі былі даны кантрольныя лічбы — ахапіць першапачатковай падрыхтоўкай 1.600 чал. За тры месяцы гэтай падрыхтоўкі ахоплена 3.225 чал.».

Вось адзін з прыкладаў узрастаючага энтузіязму мас у справе абароны краіны сацыялізму.

Вострай зброяй самакрытыкі газэта выкрывае адсталаньне, апартуністычныя тэмпы ў рабоце асоавіяхімаўскага кіраўніцтва, элементы бюрократызму ў яго апараце.

«Абязьлічка, безадказнасьць па даручаную работу, адсутнасьць дысцыпліны, пляну ў рабоце і кантролю за яго выкананьнем утрымлівае многія ячэйкі Асоавіяхіму на месцы». (Перадавая ад 1 красавіка).

Вось некалькі ўзораў таго, як «Палеская праўда» сапраўды апэрацыйна здолела паставіць абарончую работу.

«Палеская праўда» зьмяшчае агляды шматтыражак па пытаньнях абарончай работы. Напрыклад, агляд «Трымаць порах абароны сухім» (24 сакавіка) аб шматтыражцы «Сельмашэц», якая правільна паставіла гэту работу і аб шматтыражцы «Ударнік», якая недаацэньвае значэньне абарончай работы.

Узоры абарончай работы, якія паказала «Палеская праўда», павінны стаць вядомымі кожнай грамадзянскай газэце, газэце раёну, фабрыкі, заводу, саўгасу і калгасу, кожнаму рабкору і селькору.

Ва ўмовах абвастрэньня ваеннай небясьпекі для Савецкага саюзу ўвесь наш друк павінен узмацніць увагу ў справе далейшай мабілізацыі мас на узмацненьне абароназдольнасьці СССР.

Д. БОГЕН

Барацьба кіпіць

Становішча працоўных мас ва ўсёй Польшчы, а на Заходняй Беларусі ў асаблівасьці, пагаршаецца з кожным днём. Бязвыходнасьць сёньняшняга дня, жах перад заўтрашнім днём адчуваецца па ўсіх перакрыжаваньнях, у вялікіх і дробных гарадох, у паменчыцкіх маёнтках і вёсках. З кожным днём усё больш нязносным становіцца матар'яльнае становішча пераважнай большасьці насельніцтва. У рабочых кварталах лютуе голад. Галодныя дзеці, зморшчы ад стомленасьці; у бязвыніковых пошуках работы бацькі кідаюцца ў вочы кожнаму, хто наведвае Польшчу і Заходнюю Беларусь. **Эпідэмія галоднага тыфусу і іншых заразьлівых хвароб — вынік недаяданьня, зморанасьці — набываюць пагражаючыя разьмеры.** Рабочыя і беднота ўжо даўно забыла смак мяса, малака, масла і іншых прадуктаў харчаваньня.

Ня ў лепшым становішчы знаходзяцца тыя рабочыя, якія яшчэ працуюць. Сярэдні заработак гэтых «шчасьліўцаў», якія яшчэ ня выкінуты на вуліцу, якія працуюць няпоўны рабочы тыдзень, складае 1 зл. 80 гр.—2 зл. 50 гр. у дзень (злоты—22 к.). Паводле афіцыяльных (значыць няпоўных) даных, на 1 красавіка толькі па некаторых акругах Польшчы прадстаяла 50 тысяч эксмісій (г. зн. **выкідваньня з кватэр на брук 50 тыс. сем'яў**). Адначасова ўсё больш расьце дарагоўля. Нават буржуазная фашысцкая і сацыял-фашысцкая прэса ў апошні час пачынае біць трывогу з поваду ўсё ўзрастаючай дарагоўлі. Ва ўсіх галінах прамысловасьці ідзе павальнае зьніжэньне заработнай платы пры адначасовым падаўжэньні рабочага дня.

Яшчэ больш жудаснае становішча працоўнага сялянства ў Заходняй Беларусі, якая падпадае пад падвойны ўціск — капіталіста і акупанта. З усіх месц, з усіх вёсак даносіцца агульны крык роспачы. Роспач прагляда́е на ўсіх лістох, якія выпадкова ўпікнулі цэнзуры. Даем цытату з адной кароспандэнцыі — з Віленшчыны:

«Не засталося ўжо ніводнай вёскі, якая-б не галадала у поўным сэнсе гэтага слова. З кожным днём становішча сялянства робіцца ўсё больш катастрафічным. ВОСЬ УЖО КОЛЬКІ МЕСЯЦАЎ ЛЮДЗІ НЕ ЯДУЦЬ ХЛЕБА. Жыта амаль ніхто ня мае і няма грошай на куплю. ТАКСАМА АМАЛЬ НЯМА БУЛЬБЫ таму, што вельмі многа пагніло ў зямлі. Наблізжаецца горшае, бо няма чым засеяць поле. У вельмі многіх мясцовасьцях (Сьвянцяны, Ліда і інш) впошняе, што сяляне мелі, адабраў урад за падаткі. Людзі босыя і голыя, пашыраюцца эпідэміі, панує высокая сьмяротнасьць, асабліва дзіцячая».

Матар'яльная незабясьпечанасьць і фізычная зморанасьць працоўных, абрабаваньне працоўных гораду і вёскі шляхам нячуваных падаткаў, што ідуць на вайну, наступленьне капіталістаў і памешчыкаў і люты тэрор выклікаюць у масах усё большае імкненьне перайсьці ў контр-наступленьне, да барацьбы за рэвалюцыйны выхад з крызісу.

Польшча і Заходняя Беларусь ператварыліся ў бурны кацёл, дзе бесьперапынна адбываюцца гераічныя баі, у якіх з аднаго боку, адважныя камуністы-рэвалюцыянэры самааддана кіруюць і вядуць за сабой дзесяткі тысяч рабочых і сялян, а здругога боку, фашызм і сацыял-фашызм, пры дапамозе рознай дэмагогіі, «абяцаньняў» і тэрору робяць сударажныя намаганьні, каб запалохаць, разлажыць і атуманіць распачлівыя масы. На некаторых вучастках баявога фронту сацыял-здрадніцкам удаецца на час зрываць барацьбу.

Красавік і май гэтага году зьяўляюцца месяцамі вялізарных рэвалюцыйных баёў, уздыму працоўных мас, які ахапіў амаль усе цэнтры. Ужо тры месяцы вядзецца гераічная барацьба ялясных рабочых **Гайнаўкі і Белавежы** (Беластоцкае ваяводзтва). Гэта барацьба выбухае, заціхае з тым, каб з яшчэ большай сілай разгарэцца пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі. Гэта барацьба некалькіх тысяч тартачнікаў зьяўляецца паказальнікам рэвалюцыйнага ўздыму працоўных мас. Яна паказала наколькі вялікая цяга рабочых да арганізаванасьці, наколькі вялікае іх імкненьне адстаяць свае чалавечыя правы і ня даць сябе стэрарызаваць, наколькі вялікая іх салідарнасьць і імкненьне да барацьбы. Гэта барацьба ў той-жа час паказала, што там, дзе, ня гледзячы на жорсткі тэрор і рэпрэсіі, заклік кампартыі даходзіць да мас, клясавы інстынкт мас не дае атуманіць іх фразэалёгіяй сацыял-фашыстаў, гоніць прэч ад сябе «папулярных» пэпэсаўскіх дэмагогаў. Рэвалюцыйныя баі ялясных рабочых Гайнаўкі і Белавежы далі надзвычай добрыя ўзоры рэвалюцыйнай стратэгіі і тактыкі аканамічных баёў і ператварэньня гэтых баёў у рэвалюцыйна-палітычныя. Рабочыя змагаліся супроць штрэйкбрэхэраў, зды маючы іх з работы, дэманстравалі масамі, зьбіраючыся з розных месц па некалькі тысяч чалавек, ідучы на гэтыя дэманстрацыі часта за 18 клм., не адступаючы перад атакамі паліцыі, часта пераходзячы ў контр-наступленьне і баі з паліцыяй, якія часам канчаліся ахвярамі з абодвых бакоў. У аднэй такой сутычцы былі застрэлены два рэвалюцыйных рабочых.

Упартая барацьба беластоцкіх тэкстыльшчыкаў таксама ўжо працягваецца каля 5 месяцаў з некаторымі перапынкамі, выбухаючы то на адным, то на другім месцы, пераходзячы ў жорсткія баі з паліцыяй. Сацыял-фашысты пад паліцкам мас вымушаны стаць на чале гэтай барацьбы, прыкладаюць усе свае сілы, каб яе сарваць. Рашучасьць і ўпартасьць гэтых забастовак сталі наглядным прыкладам для ўсяго пралетарыяту Зах. Беларусі.

Асабліва бурліць вёска Зах. Беларусі. Лёзунг, кінуты кампартыяй яшчэ два гады таму назад — **«ні граша падаткаў ураду акупацыі, голаду, беспрацоўя і вайны»**, ператварыўся ўжо даўно у лёзунг актыўных дзеяньняў мілёнаў мас супроць польскага акупанта і яго наёмнікаў. Вёска ня плаціць падаткаў. Не праходзіць і дня, які ня прыносіў бы вестак аб сутычках сялян з экзэкутарамі і паліцыяй (экзэкутар — судовы прыстаў). Падамо толькі некалькі вытрымак з лістоў, атрыманых з Зах. Беларусі.

З Віленшчыны пішуць:

«Сьвянцяны ня плацяць падаткаў, бо няма адкуль узяць. Гавораць, што сэквэстратары (эборшчыкі падаткаў) баяцца да нас прыходзіць. Сляпяк вельмі часта выступаюць супроць падаткаў. У Падбродзкім раёне ў в. Лагавівско сэквэстратар, баючыся рэвалюцыйных настрояў сялян, зьвярнуўся з дапамогай да войта (валасны старшыня). Але сяляне зьбілі і сэквэстратара і войта і выгналі іх з вёскі. У другой вёсцы гэтага-ж раёну сялянкі рыдлёўкамі жорстка пабілі войта і выгналі сэквэстратара. У в. Н. на агульным сходзе сяляне выбралі сялянскі камітэт для барацьбы супроць падаткаў. Такія-ж выбары адбыліся і ў іншых вёсках (у лісьце падаюцца назвы сямі вёсак Сьвянцянскага раёну, дзе выбраны сялянскія камітэты). У вёсках пасьля такіх сходаў сяляне пастанаўлялі не плаціць падаткаў. Паліцыя арыштавала кіраўнікоў гэтага сходу. Тады ўся вёска сабралася, патрабуючы іх вызваленьня і, дзякуючы моцнаму напору мас спапоханая паліцыя прымушана была вызваліць таварыша».

З Навагрудчыны пішуць:

«У Любчанскай волясьці, в. Асташына сэквэстратар зьявіўся ў адну вёску апісваць маемасьць. Раптам зазванілі званы, уся вёска ўскочыла на ногі і пачалося масавае зьбіваньне экзэкутара, войта і інш. Войт і экзэкутар праз некаторы час вярнуліся ў суправаджэньні паліцыі і тады было арыштавана звыш 50 ч... У сувязі з першамайскай кампаніяй у гэту вёску зноў прышла паліцыя і пачала праводзіць арышты. АЛЕ ЎСЯ ВЁСКА ВЫСТУПІЛА СУПРОЦЬ І НЕ ДАЗВОЛІЛА НІКОГА АРЫШТАВАЦЬ, так што паліцыя ўшла ні з чым. На другі дзень ва ўсім Навагрудку былі мабілізаваны ўсе коні і вазы, якія толькі знайшліся ў горадзе і вялікі атрад паліцыі выехаў у Асташына і арыштаваў больш 100 чал...

У м. Ярэмічы ноччу з 28 на 29 красавіка жыхары на чале з жанчынамі напалі на паліцэйскі вучастак, патрабуючы вызваленьня арыштаваных.

У Гарадкутульскай волясьці (Навагрудчына) экзэкутар разам з паліцыяй апісаў за наяўлату падаткаў усе сельска-гаспадарчыя машыны і зпажыў іх у 2-х сьвірнах. На другі дзень прыехала 25 паліцэйскіх, каб забраць гэтыя машыны.

Але сяляне, сабраўшыся з суседніх вёсак, не дазволілі забраць гэтай маемасьці. Адбылася крывавая сутычка, у рэзультаце якой некалькі паліцэйскіх цяжка паранена. Пасьля гэтага былі праведзены масавыя арышты».

Фашысцкая і сацыял-фашысцкая прэса старанна замоўчвае ўсе рэвалюцыйныя выступленьні працоўных мас на ЗБ. Сакрэтныя цыркуляры міністэрстваў унутраных спраў строга забараняюць газэтам пісаць аб гэтым. Асабліва пільна адносяцца яны да падзей у вёсцы, стараючыся не дапусьціць агалашэньня ўсіх гэтых соцень выступленьняў сялян, прычым у першую чаргу ўтаіць выступленьні камуністычнай партыі ў дзень 1 мая на Зах. Беларусі. Аднак, нават ніводная вестка, якія ёсьць, паказваюць, што дзень 1 мая ў гэтым годзе прашоў пад знакам масавых выступленьняў працоўных мас. Зах. Беларусі пад лёзунгамі камуністычнай партыі: **за рэвалюцыйны выхад з крызісу, супроць крывавага акупанцкага тэрору, супроць падрыхтаваньняў ваеннага нападу на Савецкі Саюз.** У Вільні адбылася камуністычная дэманстрацыя, у якой брала ўдзел каля 700 чал. Дэманстрацыя дайшла да лукіскай турмы, ня гледзячы на моцныя кардоны паліцыі; палітзьняволеныя Лукішак віталі дэманстрантаў пяяньнем «Інтэрнацыяналу».

У Беластоку, у Лапах (чыгуначны вузел), у цэлым радзе гарадоў і мястэчак адбыліся дэманстрацыі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі з камуністычнымі транспарантамі і чырвонымі сьцягамі.

Па ўсёй Зах. Беларусі былі вывешаны сотні транспарантаў на слупох, на дротах, на дрэвах, зьяўляючыся грозная аднакай, падрыхтаваньняў да апошняй схваткі мас. У дзень 1 мая было пашырана звыш 1 млн. адозваў і рознай камуністычнай літаратуры. 1 гэта ўсё ня гледзячы на нязвычайныя нават для фашысцкай Польшчы рэпрэсіі і тэрор. Арышты напярэдадні 1-га мая былі ў поўным сэнсе слова павальныя, і няма вёскі на ЗБ (не гаворачы ўжо аб гарадох і прамысловых цэнтрах), дзе-бы напярэдадні 1-га мая ня былі праведзены масавыя арышты. У Сьвянцянах арыштавана звыш 200 чал., у Навагрудчыне — больш 600 чал., у Кобрынскім раёне—больш 200 чал. Масавыя арышты адбыліся і ў Берасьцейскай акрузе і ў радзе іншых акруг. Паводле няпоўных вестак, напярэдадні 1 мая ў аднэй толькі Зах. Беларусі было арыштавана звыш 3.000 чал. У некаторых мясцох паліцыя ня мела месца, дзе трымаць арыштаваных. У Навагрудку, напрыклад, арыштаванымі былі перапоўнены ня толькі турма і паліцэйская школа, але нават сялепы, дзе хавасьцца бульба. У м. Лагішына (на Палесьсі) былі праведзены пагалоўныя арышты. Аднак, ня гледзячы на гэта 1-га мая там адбылася шматлікая дэманстрацыя, у якой прыняла ўдзел вялікая колькасьць жанчын. У в. Асташына, як ужо паведамлялася, арыштавана звыш 100 чал.

Тыфэнзыва ўсё больш лютуе, і зьдзекуецца са сваіх ахвяр. Падаем адну жудасную карціну, узятую з ліста аднаго вадчавочцы — навагрудзкага жыхара:

«Гэтымі днямі наш горад быў ус-хваляваны жахлівай падзеяй, якую мне прышлося навочна бачыць. Падрабязнасьці справы такія: у аднэй вёсцы была арыштавана дзяўчына па падазрэньні ў прыналежнасьці да кампартыі. Ёй удалося аднак, уцячы, але яе злавілі і павялі ў Навагрудак. Па дарозе да Навагрудку яна зноў вырвалася і ўцякла. Яе зноў злавілі і павялі ў горад. У суботу, 23 красавіка, у 10 з паловай гадзін раніцы ўвесь школьны двор быў усхваляваны. Гэта ДЗЯЎЧЫНА ЎСЯ АКРЫВАЎЛЕНАЯ І ЗЬБІТАЯ, з выглядам папаўмнай бегала ад аднаго дому да другога і прасіла схаваць яе. Знайшоўся чалавек, які схаваў яе на вышцы. Была мабілізавана ўся дэфэнзыва і паліцыя, якая акружыла школьны двор і пачала дапытваць усіх яўрэяў, дзе знаходзіцца гэта дзяўчына. Ні адзін чалавек ня выдаў. Нарэшце, аднак, знайшоўся якісьці «мерзавец»—хлапец, гадоў 20, сын рэакцыянэра-сіяніста, які паказаў паліцыі, дзе схавалася дзяўчына і там яна была ўзята ўжо пасьля трацій спробы ўцячы. ВЫГЛЯД ЯЕ БЫЎ ЖАХЛІВЫ. ЯНА БЫЛА ЗЬБІТА ТАК, ШТО НІ АДНАГО ЖЫВОГА МЕСЦА НА ЦЕЛЕ НЕ ЗАСТАЛОСЯ, ЯЕ БІЛІ НА ПРАЦЯГУ ЎСЁЙ ДАРОГІ АД ШКОЛЬНАГА ДВАРА ДА ДЭФЭНЗЫВЫ (а гэта вялікая адлегласьць). Не гаворачы ўжо аб тым, што ЯЕ ЦЯГАЛІ ПА ЗЯМЛІ ЗА ВАЛАСЫ І ЎСЮ ДАРОГУ ВЫРЫВАЛІ ВАЛАСЫ, УВЕСЬ ЧАС ЯЕ ЗЬВЕРСКІ ДУШЫЛІ І БІЛІ АСАБЛІВА ПА ГАЛАВЕ. На другі дзень рабін у сінагозе дзякуў яўрэйскае насельніцтва «за дапамогу польскім акупантам злавіць небясьпечную камуністку». У горадзе сярод усяго насельніцтва пануе моцнае абурэньне супроць гэтага мерзаўца, які выдаў дзяўчыну».

Вось другі факт: у в. Кайшоўка, Навагрудзкага раёну, забіт селянін **Антось Сяргееў**, які быў арыштаваны за рэвалюцыйную дзейнасьць. Яго з турмы ўзялі ў паліцэйскі вучастак, а на другі дзень раніцою знайшлі яго ў полі забітым.

Масавыя рэпрэсіі бязупынным патокам ударяюць ня толькі па камуністах, але надзвычайна моцна за апошні час ударылі і па нацыянальна-вызваленчым руху. Польскі акупант увесь час стараецца пры дапамозе падачак і подкупаў і пагрозамі заваёўваць на свой бок хісткія элементы ў нацыянальна - вызваленчым руху, імкнучыся пры дапамозе здрадніцкаў і ахранынкаў з лягеру беларускіх нацыянал-фашыстаў (Астроўскі, Луцкевіч, Акінчыц і інш.) захапіць у свае рукі кіраўніцтва нацыянальна-вызваленчым рухам.

За апошні час усе намаганьні акупантаў накіраваны на тое, каб захапіць кіраўніцтва ТБШ (таварыства беларускай школы). Але ўсе гэтыя спробы ня мелі посьпеху, бо збанкрутаваныя беларускія ахранынкі (Астроўскі і К-°) настолькі «папулярны» сярод працоўных мас на Зах. Беларусі, што масы іх проста гоняць вон, дзе толькі яны адважваюцца выступіць. Тады польскі акупант пайшоў на адкрыты тэрор і пачаў граміць рэшткі не ці квітнеючай масавай арганізацыі ТБШ. Так была разгромлена Мірская ўправа ТБШ з усімі яе гурткамі, якая налічвала прыблізна 2.000 членаў; пачаўся разгром ТБШ у Косаўшчыне і г. д. Забаронен зьезд ТБШ, назначаны ў Вільні, забаронены таксама гурток ТБШ у Вільні.

Польская ахранка зьдзекуецца над правадырамі рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху. **Тарашкевіч** ужо паўтара гады ў турме (як вядома, ён быў захвачан польскімі агентамі пры праезьдзе праз Данцыгскі калідор у міжнародным цягніку). Тарашкевічу да гэтага часу яшчэ **не прад'явлен акт абвінавачаньня і не скончана сьледзтва.** Ахранынкі «выцуквацюць» сьвежыя матар'ялы, імкнучыся адтэрмінаваць працэс над Тарашкевічам. Гнуснае мэта гэтых махінацый аж надта ясная: **неабходна сфабрыкаваць такі акт абвінавачаньня, каб ён меў хаця-б некаторыя падабенства законнасьці і «праўдзівасьці».** Адначасова дэфэнзыва адкладае гэты працэс, баючыся шырокага абурэньня працоўных мас, асабліва небясьпечнага для яе цяпер, калі няпавісьць да польскага акупанта ўсё больш расьце ў масах беларускага працоўнага насельніцтва.

Забойствы, якія суправаджаюцца нечалавечымі зьбіваньнямі і зьдзекамі, масавыя пакараньні сьмерцю, разгул паліцэйшчыны пры актыўнай дапамозе папоў, рабінаў і ксяндзоў і сацыял-фашысцкіх прахвостаў — вось якімі сродкамі польскі акупант і кіруючыя клясы фашысцкай Польшчы думаюць «уціхамірыць» бурлівы рэвалюцыйны кацёл у Польшчы і Зах. Беларусі. Але ў гісторыі клясавай барацьбы яшчэ ня было такога выпадку, каб паліцэйшчына і ўрад змаглі падоўга і сапраўды задушыць узрастаючы рэвалюцыйны рух.

Ня ўдасца гэта цяпер і фашысцкаму ўраду Польшчы. Рэвалюцыйнае абурэньне прарываецца праз розныя каналы і цячэ ўсё больш шпарка, усё больш бурна, прарываючы плаціны паліцэйскіх гвалтаў і кардонаў. Барацьба ў Польшчы і Зах. Беларусі ўсё больш бурліць.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

НА ТАРФЯНЫХ ПАЛЁХ ЯШЧЭ НЕ РАЗГОРНУТЫ ЎДАРНЫЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ

ЗАВОДЫ БЕЛТОРФУ ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА ВЫКОНВАЮЦЬ СВАЕ ВЫТВОРЧЫЯ ЗАДАНЬНІ

Здабыча торфу па заводах Белторфаб'яднаньня

18 мая	Дзён. заданьне—7,150 тон Здабыта . . —1.390 „	Проц. выкан. 19,4

Торфзавод «Закрашынскі мох» здабыў 130,9 тон—61,2 проц.; «Асінторф» — 512,7 т. —24,6 проц; «1 мая»—85,5 тон—23,8 проц; «Чырвоная Беларусь»—106 т.—23,1 проц; «Смалявічы»—118,7—22,9 проц; «Шлях сацыялізму»—301,2—21,2 проц; «Бальшавік»—115,9—11,4 проц.; «Чырвоны сьцяг»—19 тон—3,3 проц.

Заводы «Свабода» і імя Даўмана не працавалі з прычыны выходнага дня.

Выклік „Асінторфу" прымаем

У мінулым годзе наш завод працаваў нездавальняюча. Нявыстарчальная падрыхтаванасьць балотнай плошчы, несвалчасовы рамонт машын і позьні пуск іх у эксплёатацыю, цякучасьць рабочай сілы, няўмелая расстаноўка рабочых і арганізацыя іх працы—усё гэта прывяло да значнага прарыву ў выкананьні праграмы торфаздабычы.

Сёлета ў падрыхтоўцы да сэзону мы таксама мелі шмат перашкод. Асабліва адбілася на падрыхтоўцы зацяжка ў перадачы заводу ў веданьне непасрэдна шаўковай фабрыкі, якую ён забясьпечвае торфаапалам.

Ня гледзячы на гэтыя перашкоды, калектыў нашага заводу, пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, пабальшавіцку змагаўся за свалчасовую і добрую падрыхтоўку да сэзону. У выніку торфаздабыча распачалася ў тэрмін. 4 мая была пушчана першая машына, 6 мая—астатнія дзьве машыны. У мэтах ліквідацыі абязьлічкі ў рабоце, да кожнай машыны прымацаваны шароўшчыкі і дзяжурныя сьлесары. Для паляпшэньня грамадзкага харчаваньня і якасьці абедаў намі разгорнуты самазагатоўкі, перабасталявана сталоўка.

У гэтым годзе мы павінны здабыць 40.000 тон торфу, які цалкам пойдзе на апал для ЦЭЦ магілеўскай шаўковай фабрыкі. Так, напрыклад, брыгада тав. Лапіцкага замест 32.000 цаглін, паводле заданьня, выпрацоўвала 25.000, брыгада тав. Дзянісевіча —20.000, брыгада Шчарбакова—22.000, астатнія брыгады яшчэ менш.

Гэта нас абавязвае прыкласьці ўсе намаганьні да таго, каб шляхам разгортваньня сацыялістычных форм працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва, правільнай расстаноўкі сіл і арганізацыі працы рабочых дабіцца ў бліжэйшыя дні ня толькі поўнага выкананьня пляну, але і пакрыцьця запазычанасьці першых дзён сэзону.

Прымаючы выклік Асінторфу аб ударным разгортваньні торфаздабычы, мы запэўняем ЦК КП(б)Б і ўсю пралетарскую грамадзкасьць БССР, што пад кіраўніцтвам заводзкай партарганізацыі, пры дружнай рабоце ўсяго калектыву заводу, плян у колькасьці 40.000 тон торфу намі будзе выкананы поўнасьцю і ў тэрмін.

Дырэктар заводу ПАЛЖІН.
Сакратар парт'чэйкі ФУРМАН.
Старшыня торфкому ГАЯНКОЎ.

Здабыча машына-фармовачнага торфу на торфзаводзе «Шлях сацыялізму».

Торфрабкоп чакае... нарадаў

БАБРУЙСК. (Наш кар.).

Хаця торфаздабыча на заводзе «Новая Беларусь» пачалася раней тэрміну (першая машына была пушчана 28 красавіка), але тэмпы яе надзвычай ніякія. Некаторыя брыгады выпрацоўваюць ня больш 30-40 проц. нормы.

Адным з адсталых вучасткаў, якія перашкаджаюць нармальнаму ходу торфаздабычы, зьяўляецца нездавальняючая работа торфкопу, які не павярнуўся тварам да вытворчасьці. У рабоце праўленьня торфкопу, на чале з тав. **Клокавым**, няма патрэбнай гібкасьці і аперацыйнасьці, ў галіне паляпшэньня рабочага снабжэньня.

Замест вышукваньня дадатковых харчовых рэсурсаў, праўленьне торфкопу спакойна чакае цэнтралізаваных фондаў, ня прымае ніякіх захадаў да разгортваньня самазагатовак. Больш таго, яно нават не клапоціцца атрымаць тыя прадукты, якія вызначаюцца па нарадах. Так, напрыклад, у свой час быў дан нарад на атрыманьне кароў, але паколькі іх ня было, торфкопу прапанавалі замест кароў узяць парасят. Аднак, праўленьне не сьпяшалася атрымаць гэтых парасят. У выніку нарад быў зануляваны. Зараз атрыман нарад на проса. Ня гледзячы на тое, што замест непаступіўшага яшчэ проса магчыма атрымаць іншыя крупы, праўленьне паранейшаму чакае паступленьня проса. Торфсэкцыя Белкаапсаюзу прысылае расцэнкі на тавар са спазьненьнем на 2-3 тыдні. У выніку значная частка тавараў ляжыць мёртвым капіталам і ня можа быць пушчана ў продаж. У даны момант такіх тавараў ляжыць на суму каля 5.000 руб.

Дрэнна стаіць справа і з рэалізацыяй пастановы бабруйскага райпрафсавету аб узмацненьні культурна-масавай работы на торфзаводзе. Дагэтуль ні інспэкцыя нарасьветы, ні райком саюзу працасьветы ня прынялі ніякіх мер па забесьпячэньні торфзаводу ліквідатарамі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці. Есьць пагроза, што яны будуць прысланы ў канцы сэзону, як у мінулым годзе.

ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ І РАБОЧЫЯ МЕНСКУ ВЫСТУПАЮЦЬ У ПАХОД ЗА РАЗГОРТВАНЬНЕ КАЛГАСНАГА ГАНДЛЮ

(На нарадзе пры рэдакцыі „Зьвязды")

Менск можа і павінен паказаць узоры арганізацыі калгаснага гандлю. Пры фабрыках і заводах Менску павінны быць калгасныя магазыны. Есьць усе ўмовы для наладжаньня бесьперабойнай работы савецкага рынку. **ЦК і Менгарком КП(б)Б вызначылі канкрэтныя задачы, далі вычарпальныя паказаньні.**

Аднак, гэтыя ўказаньні, гэтыя дырэктывы каапэрацыйнымі, гаспадарчымі, калгаснымі і зямельнымі арганізацыямі ажыцьцяўляюцца недапушчальна **марудна.**

З мэтай высьвятленьня становішча работы і паскарэньня рэалізацыі важнейшых пастаноў партыі аб калгасным гандлі рэдакцыяй «Зьвязды» склікана нарада прадстаўнікоў менскіх арганізацый. На нарадзе выявілася, што канкрэтнае ўказаньне Менгаркому КП(б)Б аб арганізацыі калгасных магазынаў пры заводах «Кастрычнік», абутковай і «Камунар», імя Варашылава, друкарні імя Сталіна і ў будаўнікоў ня выканана. Толькі пры заводзе «Бальшавік» забясьпечана адкрыцьцё магазыну ў бліжэйшыя дні. Ужо заключан дагавор з калгасамі. За гэту справу ўзяўся парткалектыў, заўком і ЗРК.

У іншых-жа мясцох, як ня дзіўна, ЗРК ня выступілі яшчэ арганізатарамі калгаснага гандлю. Толькі на нарадзе кіраўнікі асобных ЗРК зразумелі, што—гэта іх кроўная справа, бо ЗРК у першую чаргу адказвае за снабжэньне рабочых тэй ці іншай фабрыкі, або заводу.

Пасьля нарады ўсе выпэйпамянёныя ЗРК сумесна з фабзаўкомамі выслалі брыгады ў вызначаныя калгасы для правядзеньня растлумачальнай работы і заключэньня дагавораў на прадукцыю, якую гэтыя калгасы рэалізуюць праз свае магазыны.

Савецкі рынак—важнейшы фактар ажыцьцяўленьня непасрэдных сувязяй вытворцаў с.-г. прадуктаў са спажыўцом. Кіраўніцтва некаторых і цэнтральных і гарадзкіх каапэрацыйных, гаспадарчых, калгасных арганізацый ня схільна недаацэньваць гэтага на словах і на паперы. На справе-ж у пытаньні арганізацыі і абсталяваньня менскіх рынкаў—міжведамственая бюракратычная перапалка і толькі. На нараду дастаўлен дакумант—жывы сьведка гэтай чыноўнічай чахарды.

Гарсавет адвёў месца на рынкі, дзе павінна быць пабудавана 80 ларкоў Белкаапсаюзу, 20 Белгандлю і 40-50 для калгасаў. Здавалася-б задача ясная—**прыступіць неадкладна да будаўніцтва.** Замест гэтага ў гарсавет дасылаецца паперка наступнага зьместу: «Белкаапсаюз лічыць магчымым (?) унесьці авансам некаторую суму ў лік арэндпай платы за памянёныя ларкі і просіць вызначыць тэрмін для канчатковага афармленьня гэтай справы».

— Мая хата, як кажуць з краю, будуйце ларкі (для Белкаапсаюзу зразумела), а мы ўнясем авансам «некаторую суму».

Цяжка знайсьці больш яркі прыклад казённага вузка - ведамственага падыходу да выкананьня канкрэтных задач разгортваньня савецкага гандлю.

Старшыня гарсавету тав. **Валодзька** не без падставы на адвароце гэтай адносны зазначыў, што «калі вы думаеце так эпэргічна (?) арганізоўваць савецкі базар, то відаць будзе магіла ўсёй справе». Нельга, бясспрэчна, прызнаць здавальняючымі і тэмпы работы гарсавету. Ён не праяўляе яшчэ патрэбнай настойлівасьці па рэалізацыі ўзятых на сябе абавязацельстваў, вызначаных у лісьце харкаўскаму гарсавету.

І гарсавет і райкалгассаюз, гарпрафсавет і каапэрацыйныя арганізацыі, заняўшыся пытаньнем (**далёка немалаважным**) аб ларкох, вельмі мала ўвагі аддаюць рабоце ў калгасах. **Гэты важнейшы бок справы недаацанілі пры арганізацыі першага выезду калгасаў (24 красавіка) на рынак, абумовіўшы такім чынам яго зрыў.**

Улічваючы вялізарнейшае і рашаючае значэньне масава-растлумачальнай работы, нарада, выходзячы з пастановы сходу менскага партактыву, выказалася **за правядзеньне ў бліжэйшыя дні масавага выезду рабочых шэфскіх арганізацый у калгасы для папулярызацыі апошніх пастаноў ЦК, СНК і ЦВК СССР аб збожжа- і жывёлазагатоўках, разгортваньні і парадку правядзеньня калгаснага гандлю і забесьпячэньні практычных мерапрыемстваў па іх ажыцьцяўленьні.**

Разам з гэтым нарада выказалася за неабходнасьць **стварэньня пры рэдакцыі «Зьвязды» штабу садзейнасьці** разгортваньню калгаснага гандлю ў Менску. У штаб увойдуць прадстаўнікі: гаркому КП(б)Б, рэдакцыі «Зьвязда», гарпрафсавету, райкалгассаюзу, гарснабу, Белкаапсаюзу, Белгандлю, Калгасцэнтру, Наркамзему і прамкаапэрацыі.

У практыцы арганізацыі калгасных магазынаў ужо дапушчаны некаторыя скажэньні. Аб іх гаварылася на нарадзе, яны павінны быць вядомы кожнаму, хто зьвязан з гэтай справай, з тым, каб **не паўтараць памылак.**

Сутнасьць гэтых скажэньняў заключаецца ў імкненьнях затушаваць ініцыятыву і самастойнасьць калгасаў, ператварыць іх у простых пастаўшчыкоў прадуктаў. Гомельскае ТСТ чыгуначнікаў, напрыклад, калгасныя ларкі ператварылі ў загатоўчыя пункты. Такую-ж прыкладна памылку дапусьцілі работнікі ЗРК заводу «Бальшавік».

Трэба катэгарычна папярэдзіць усякія тэндэнцыі сказіць сутнасьць калгаснага гандлю або падмяніць яго самазакупачнымі ці загатоўчымі апэрацыямі.

Калгасны магазын ня толькі павінен быць запоўнен прадуктамі сельска-гаспадарчай вытворчасьці, але кіраўніцтва ім цалкам належыць калгасу, яго загадчык і работнікі павінны быць калгасьнікамі. У сваю чаргу ЗРК, фабзаўкомы павінны аказаць дапамогу калгасам у прадастаўленьні і абсталяваньні памяшканьня, у вядзеньні рахункаводзтва і іншых арганізацыйна-гаспадарчых, тэхнічных пытаньнях. У справе арганізацыі калгасных магазынаў у Менску пэўным тормазам зьяўляецца адсутнасьць патрэбнай колькасьці памяшканьняў. Рад гандлёвых памяшканьняў заняты пад іншыя патрэбы (майстэрні, склады, цырульні і інш.). Менкамгас пакуль што адмахваецца толькі паперкамі і абяцанкамі.

Час ужо, каб кіраўніцтва Менкамгасу ня толькі на словах прызнавала неабходнасьць прадстаўленьня магазынаў, але са свайго боку ўжыло ўсе неабходныя меры для іх адкрыцьця.

Масавы выезд рабочых шэфскіх і прафсаюзных арганізацый, які 27 мая наладжваецца «Зьвяздой» і гаркомам КП(б)Б павінен стаць **магутным штуршком для стварэньня ў Менску ўзорнага савецкага рынку і калгасных магазынаў,** праз якія калгасьнікі, з аднаго боку, і каапэрацыйна-гандлёвыя арганізацыі—з другога, будуць **СЫСТЭМАТЫЧНА** рэалізоўваць прадукцыю сельска-гаспадарчай вытворчасьці і прамысловыя тавары.

Гарпрафсавет (які да рэчы ня прыслаў свайго прадстаўніка на нараду) і фабзаўкомы, парткалектывы г. Менску павінны правесьці вялікую работу, прыняць самы актыўны ўдзел у наладжаньні масавага выезду ў калгасы.

Толькі праз **масавую, праз узмоцненую арганізацыйную** работу і барацьбу з коснымі апартуністычнымі тэндэнцыямі, са спэкуляцыйнымі элемэнтамі ляжыць шлях да арганізацыі ўзорнага калгаснага гандлю.

Аб практычных мерапрыемствах па разгортваньні калгаснага гандлю

Пастанова Менгаркому КП(б)Б

1. У мэтах папулярызацыі апошніх пастаноў ЦК УсеКП(б), СНК і ЦВК СССР аб збожжа і жывёлазагатоўках, калгасным гандлі і для забесьпячэньня хутчэйшага разгортваньня калгаснага гандлю лічыць неабходным на працягу да 1-га чэрвеня правесьці шырокую растлумачальную работу па гэтых пастановах, паладзіўшы выезды гарадзкога партактыву і рабочых арганізацый у падшэфныя калгасы.

2. У сувязі з гэтым ухваліць прапанову нарады пры рэдакцыі «Зьвязда» аб арганізацыі 27 мая масавага выезду гарадзкіх шэфскіх арганізацый у вёску. Даручыць агітмасаваму аддзелу сумесна з рэдакцыяй «Зьвязды» забясьпечыць належную падрыхтоўку і правядзеньне гэтага мерапрыемства.

3. Падтрымаць прапанову нарады і лічыць зусім мэтазгодным стварэньне пры рэдакцыі «Зьвязды» штабу садзейнасьці разгортваньню калгаснага гандлю ў Менску. Ад гаркому КП(б)Б увесьці ў склад штабу тав. **Абрамава.**

4. Адзначаючы невыкананьне да гэтага часу пастановы гаркому аб адкрыцьці вызначанай колькасьці калгасных магазынаў пры фабрыках, заводах, — прапанаваць райкалгассаюзу тав. **Грушніку,** парткалектывам і старшыням ЗРК заводу «Кастрычнік», абутковай фабрыкі, друкарні імя Сталіна, заводу «Камунар», імя Варашылава, будаўнікоў неадкладна прыняць захады да адкрыцьця магазынаў. Прапанаваць т. **Пінхасіку** ў пяцідзённы тэрмін забясьпечыць магазыны памяшканьнямі.

5. **Лічыць неабходным наладзіць 29 мая масавы выезд калгасаў, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў на рынак для рэалізацыі лішкаў сваёй прадукцыі.**

6. Выходзячы з выключна вялікага палітычнага значэньня, якое адыгрывае калгасны гандаль у справе паляпшэньня рабочага снабжэньня і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, гарком прапануе ўсім парткалектывам, парт'ячэйкам узяць пад штодзённы нагляд гэты вучастак работы, аказваючы калгасам і калгасьнікам практычную дапамогу, растлумачваючы ім, якія ільготы і выгады атрымлівае гаспадарка і кожны калгасьнік ад разгортваньня гандлю лішкамі сваёй прадукцыі.

Трэці ўсебеларускі зьезд Чырвонага крыжу

НАЙШЫРЭЙШЫЯ МАСЫ ПРАЦОЎНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ЗРОБІМ АКТЫЎНЫМІ УДЗЕЛЬНІКАМІ САНІТАРНАЙ АБАРОНЫ КРАІНЫ

З дакладу старшыні ЦК таварыства Чырвонага крыжу БССР тав. ХАЦКЕВІЧА

Работа Беларускага таварыства Чырвонага Крыжу, як грамадзка-пралетарскай арганізацыі, была шчыльна зьвязана з работай іншых грамадзкіх, савецкіх, гаспадарчых і культасветных арганізацый і падпарадкавалася агульным задачам сацбудаўніцтва.

Трэба перш за ўсё спыніцца на пытаньнях і характарыстыцы палітычнага і арганізацыйнага становішча чырвона-крыжнай арганізацыі. У былое кіраўніцтва Чырвонага Крыжу пралезьлі нацдэмаўскія элемэнты, як Цьвікевіч і інш. У радзе выпадкаў ячэйкі Чырвонага Крыжу былі засьмечаны клясава-варожымі элемэнтамі. Нацдэмы падбіралі кіруючых людзей адпаведна сваім мэтам і задачам. Сама работа чырвона-крыжных арганізацый у пасобных зьвеньнях насіла фармальны, а не грамадзка-масавы дзелавы характар, не вялося сур'ёзнай санітарна-асьветнай, арганізацыйна-масавай, санітарна-абарончай работы, ня выконваліся тыя задачы, якія ставіліся партыяй перад чырвона-крыжнымі арганізацыямі. Нацдэмы імкнуліся пралетарскі зьмест работы, клясавую сутнасьць, савецкі дух выганяць з чырвона-крыжных арганізацый.

ЦК КП(б)Б зьняў старое кіраўніцтва Чырвонага Крыжу БССР. Новаму кіраўніцтву прышлося правесьці рашучую барацьбу са спадчынай нацдэмаўшчыны, заняцца работай па ўцягненьні шырокіх працоўных мас у нашу арганізацыю. Нам прышлося зрабіць упор на паляпшэньне чырвона-крыжных арганізацый за лік рабочых, работніц, калгасьнікаў і калгасьніц на вёсцы. У выніку склад арганізацыі колькасна і якасна палепшыўся і палепшыўся. Аднак, таварышы, тут далёка ня ўсё яшчэ зроблена. Уперадзе яшчэ шмат работы. Недастатковы ахоп членствам рабочых і калгасьнікаў—сур'ёзны недахоп работы, пачынаючы з ЦК Чырвонага Крыжу і канчаючы нізавымі ячэйкамі.

Па сёнешні дзень мы маем такое становішча чырвона-крыжных арганізацый: да 2-га зьезду налічвалася 36.109 членаў, на 1 студзеня 1931 г. было 103.944 члены і на сёнешні дзень мы маем звыш 110 тысяч членаў. Па сацыяльным становішчы арганізацыя мае: рабочых — 22 проц., сельгасрабочых — 5 проц., калгасьнікаў—26 проц., аднаасобнікаў - беднякоў — 3 проц., аднаасобнікаў-сераднякоў — 3 проц., служачых—14 проц., вайскоўцаў—8 проц., вучняў—12 проц., саматужнікаў—3 проц., утрымацаў рабочых—2 проц., утрымацаў служачых—2 проц. Па партыйнасьці: членаў партыі — 5 проц., членаў ЛКСМБ—9 проц. Партыйна-камсамольская праслойка яшчэ нязначная.

Па БССР налічваецца 2.000 чырвона-крыжных тараджкіх і вясковых ячэек. Мы лічым, што пры фабрыках і заводах, саўгасах і калгасах колькасьць ячэек невыстарчальная, трэба паставіць задачу іх павялічэньня. Значна палепшылася і ўмацавалася матар'яльная база таварыства. Калі бюджэт Чырвонага Крыжу 1930 г. прыняць за 100 проц., дык у 1931 годзе мы мелі павялічэньне на 229 проц. На 1932 год прынят бюджэт у суме 3.006 тыс. руб., што азначае рост на 510 проц. супроць 1930 г. Мы маем моцную матар'яльную базу, на падставе якой павінны разгарнуць шырокую работу.

Чырвона-крыжная арганізацыя рэалізавала сярод насельніцтва вёскі ў 1932 г. пазыкі «Трэці рашаючы» на суму 155 тыс. руб. Рэалізавана білетаў лётарэі Чырвонага Крыжу на 450 тыс. руб. У гэтай справе мы занялі амаль што першае месца ў Саюзе ССР. Але, таварышы, наш агульны ўдзел у гаспадарча-палітычных кампаніях застаецца ўсё-ж далёка недастатковым.

Новы прыток рабочых у прамысловасьць і рост запатрабаваньняў з боку рабочых патрабуе ад нас пашыраных мерапрыемстваў па санітарна-бытавым абслугоўваньні. Масы калгасьнікаў і калгасьніц таксама патрабуюць да сябе нашай увагі ў сэнсе паляпшэньня санітарна-бытавога абслугоўваньня. За 1931 год мы ў калгасах правялі значную работу. Былі арганізавана 87 ясьляй, 102 дзіцячыя пляцоўкі, 32 пункты першай дапамогі, 30 радзільных ложкаў, 12 дэрасовачных зубных габінэтаў і больш паўтары тысячы санітарных пастоў. На 1932 год запраектавана і ажыцьцяўляюцца значна большыя мерапрыемствы ў гэтай галіне.

Перш за ўсё, у рабоце таварыства слаба разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Мы заключылі дагавор з Заходняй вобласьцю на лепшае правядзеньне веснавой пасеўкампаніі, але гэты дагавор ажыцьцяўляецца вельмі марудна. Наша арганізацыя яшчэ ня стала дастаткова масавай. ЦК КП(б)Б у пастанове адзначыў, што побач з дасягненьнямі ў рабоце чырвона-крыжная арганізацыя БССР яшчэ ня стала сапраўднай масавай арганізацыяй. Адна з асноўных галін нашай работы —абарончая работа не знайшла яшчэ свайго належнага месца.

Даўшы падрабязны аналіз міжнароднага становішча, т. Хацкевіч спыніўся на чарговых задачах Чырвонага Крыжу ў сувязі з гэтай абстаноўкай.

Цьвёрда праводзячы палітыку міру, мы павінны ні на хвіліну не забываць таго, што акружаны ворагамі капіталістамі, якія імкнуцца зьнішчыць першую ў сьвеце пралетарскую дзяржаву. Вось чаму мы павінны клапаціцца кожны дзень аб становішчы абароны нашай краіны.

Мы павінны клапаціцца аб нашай геройскай Чырвонай арміі. Разам з гэтым нам трэба павялічыць работу па ваяжацыі працоўных мас. Нам, Чырвонаму Крыжу, трэба ўцягнуць у справу вайскова-санітарнай абароны дзесяткі тысяч працоўных. Гэта задача асабліва актуальная ў БССР, як прымежнай рэспубліцы.

Мы павінны забясьпечыць у 1932 г. набыцьцё ведаў вайскова-санітарнай абароны звыш 150.000 працоўных БССР і 13.000 камсамольцамі, арганізаваць 375 гурткоў. Гэту работу мы павінны разгарнуць і правесьці паўдарнаму.

Нам трэба шчыльней зьвязацца з Асоавіяхімам, камсамолам, Чырвонай арміяй і дапамагчы ім вырашаць іх задачы.

Чырвона-крыжная арганізацыя зьяўляецца адной з важнейшых грамадзкіх абарончых арганізацый. А таму на нас ускладаюцца адказьнейшыя задачы падрыхтоўкі да санітарнай абароны працоўных мас.

Пад кіраўніцтвам партыі, змагаючыся з праяўленьнямі апартунізму, ачышчаючы рады арганізацыі ад клясава-варожых элемэнтаў, якія імкнуцца пралезьці, праламляючы ў сваёй рабоце 6 умоў т. Сталіна, разгортваючы бальшавіцкую самакрытыку мы здолеем гэтыя задачы выканаць.

Да ўпартай работы, на барацьбу за бальшавіцкія тэмпы, за высокую якасьць заклікаю я ўсе арганізацыі Чырвонага Крыжу.

Л. ЧАРНЯКОЎ

МОЦНАЕ ПАРТЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА—ЗАРУКА ПАСЬПЯХОВАЙ ПЕРАБУДОВЫ РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ

Прайшло больш году з часу пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16 красавіка 1931 году аб перабудове рабселькораўскага руху. За гэты год **БССР дасягнула значных посьпехаў у росьце і перабудове работы нізавога друку і з рабселькорамі, ва ўзмацненьні партыйнага кіраўніцтва імі.** Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы бязупынаму і сыстэматычнаму кіраўніцтву з боку ўсёй КП(б)Б і яе цэнтральнага камітэту.

Штодзенна практычна займаючыся пытаньнямі работы нізавога друку і з рабселькорамі, **ЦК партыі заваструў увагу мясцовых партыйных арганізацый** па неабходнасьць лічыльна зацяцца кіраўніцтвам рабселькораўскім рухам, выходзячы з данай у пастанове ЦК УсеКП(б) «аб сельскім раённым і нізавым друку» ўстаноўкі, што «нізавым друкам раёну і работаю сярод рабселькораў павінны кіраваць райпарткомы, прыцягваючы да актыўнага ўдзелу партячэйкі і рэдакцыі раённых газэт».

Месячнік друку ў 1931 годзе, вялізарная работа па падрыхтоўцы і правядзеньні 2-га ўсебеларускага зьезду рабселькораў праходзілі пад знакам барацьбы за ўзмацненьне партыйнага кіраўніцтва рабселькораўскім рухам.

Выключна **буйнае палітычнае значэньне надаў ЦК КП(б)Б абвешчанаму «Правдой» усесаюзнаму конкурсу** нізавых газэт на лепшую работу на арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. У «Зьвязьдзе» было зьмешчана некалькі перадавых артыкулаў па пытаньнях конкурсу. Конкурсная камісія пры «Зьвязьдзе» правяла вялізарную работу па разгортваньні конкурсу. Культпроп ЦК правёў некалькі нарад рэдактароў цэнтральных і раённых газэт. На першым этапе конкурсу па ўсіх раёнах БССР праведзены спэцыялізаваныя нарады рабселькораў.

Да веснавой сяўбы па пастанове ЦК па БССР праведзены **10 куставых міжраённых нарад рэдактароў калгасных насьценных газэт. На гэтых нарадах прыняло ўдзел да 650 таварышоў. ЦК КП(б)Б вынес спэцыяльную пастанову аб разгортваньні сеткі брыгадных штодзенак непасрэдна ў калгасных брыгадах.**

Гэта **сыстэматычная ўвага пытаньням рабселькораўскага руху знайшла сваё яркае адлюстраваньне ў пастановах XIV зьезду КП(б)Б,** які прыняў спэцыяльную пастанову **аб задачах і далейшых мерапрыемствах па кіраўніцтве рабселькораўскім рухам і разгортваньні работы па конкурсе.**

Цэнтральны камітэт КП(б)Б у сваёй пастанове аб конкурсе даў лёзунг: **«Справа арганізацыі і правядзеньня конкурсу—справа ўсёй КП(б)Б, справа ўсёй пралетарскай грамадзкасьці БССР».** Гэты лёзунг быў падхоплен усімі партыйнымі арганізацыямі на мясцох. Гэты лёзунг стаў **адпраўным.**

Большасьць раённых партыйных арганізацый, разгортваючы работу па конкурсе, дабілася значных посьпехаў у кіраўніцтве рабселькораўскім рухам.

Канкрэтнае кіраўніцтва па асобных пытаньнях работы нізавога друку, праверка ўказаньняў, барацьба за адказнасьць з боку нізавых ячэек работай нізавога друку—сталі штодзённым мэтадам работы значнай колькасьці партыйных арганізацый (**Слуцак, Гомель, Рэчыца, Клімавічы, Віцебск, Жлобін і г. д.**).

Каб пераканацца ў гэтым, даволі прывесьці толькі той факт, што **Жыткавіцкі** райком КП(б)Б, напрыклад, **перадаў у кантрольную камісію справу аб сакратарох Ляхавіцкай, Пухавіцкай і Руднянскай ячэек за бязьдзейнасьць па конкурсе, а сакратара Пухавіцкай ячэйкі зьняў з работы.**

Асобныя раёны (**Слуцак, Гомель, Віцебск, Жлобін**) дабіліся бясспрэчна вялікіх посьпехаў ва ўзмацненьні парткіраўніцтва рабселькораўскім рухам і перабудоваю яго. **Канкрэтныя ўказаньні** па асобных галінах работы нізавога друку, **дыфэрэнцыяваны падыход** да работы з рабселькорамі адпаведна са спэцыфічнымі ўмовамі кожнай галіны прамысловасьці і сельскай гаспадаркі—вось што **характэрна для парткіраўніцтва ў гэтых раёнах. ВІЦЕБСКІ РАЙКОМ,** напрыклад, абгаварыў ініцыятыву сваёй гарадзкой газэты «**Віцебскі пралетары**» і вынес спэцыяльнае канкрэтнае рашэньне аб мерапрыемствах па правядзеньні шасьцідзённага «**селькораўскага паходу за вопытам**» у горад 100 селькораў.

Для поўнай характарыстыкі стану парткіраўніцтва ў раённых партарганізацыях досыць адзначыць, што **больш чым палова прахадзіўшых у сьнежні, студзені райпартканфэрэнцый абгаварылі пытаньне аб конкурсе нізавых газэт і ў сувязі з гэтым аб рабоце нізавога друку.**

Вядома, посьпехамі ў паляпшэньні парткіраўніцтва могуць пахваліцца далёка ня ўсе райкомы. Мы можам назваць **Лагойскі** райком, дзе амаль ніякай увагі не аддаецца пытаньням нізавога друку. Даволі характэрным зьяўляецца і тое, што **Гарадоцкі** райком прыняў вельмі вялікую, поўную агульных слоў пастанову, не праверыў яе, не забясьпечыў выкананьня, і таму там справа з кіраўніцтвам нізавым друкам **так і застаецца на нізкім узроўні.**

Але ўсе гэтыя факты ні ў якай меры **ня могуць зьнізіць** той вялікай работы, якая праводзіцца большасьцю райпартарганізацый у справе ўмацаваньня парткіраўніцтва нізавым друкам.

Такая работа партыйных арганізацый яшчэ вышэй узьняла работу нізавога друку, **узмацніла тэмпы перабудовы рабселькораўскага руху.**

Бязумоўна палепшылася партыйнае кіраўніцтва і ў нізавых ячэйках як на прадпрыемствах, так і **ў саўгасах і калгасах.**

Гэта паляпшэньне перш за ўсё выражаецца ў штодзённай увазе нізавым газэтам і іх рабоце. Большасьць ячэек зараз ужо **не задавальняецца** «выпускам» насьценгазэт. **Яны патрабуюць новых дзейсных форм** апэрацыйна-масавай работы, дапамагаюць іх знаходзіць, вучаць іх ужываць.

Так, партарганізацыя заводу сельгасмашынабудаўніцтва «**Гомсельмаш**» (Гомель), штодзенна займаючыся работай сваіх нізавых газэт, дабілася іх значнай апэрацыйнасьці. Штодзённыя, а часта і штогадзінныя «трывогі», «сыгналы», частыя рэйды, пастаноўка праз друк новых пытаньняў—сталі сыстэмай работы на Гомсельмашы. Гэты завод з глыбокага вытворчага прарыву ў недалёкім мінулым, стаў на шлях сыстэматычнага перавыкананьня прамфінпляну. Бязумоўна, вялікую ролю ў гэтым адыграў нізавы друк заводу, пад кіраўніцтвам сваёй партарганізацыі.

Можна прывесьці яшчэ рад прыкладаў партыйнага кіраўніцтва ў ячэйках. **Партарганізацыі фабрык і заводаў «Кастрычнік», абутковай, заводу «Пралетары», «Чырвоны мэталіст» і г. д. далёка ня вычэрпваюць сьпіс тых вытворчых парт'ячэек, якія аддаюць шмат увагі кіраўніцтву сваім нізавым друкам.**

Пэўныя посьпехі мы маем за гэты год і ва ўзмацненьні парткіраўніцтва нізавым друкам **на чыгунцы.** Гэта асабліва важна адзначыць у сувязі з тым, што год назад парткіраўніцтва на гэтым вучастку было вельмі слабым. Зараз ужо **Гомельскі і Жлобінскі вузлы** гадавіну перабудовы рабселькораўскага руху сустрэлі радам посьпехаў ва ўзмацненьні сваёй вытворча-арганізатарскай ролі ў барацьбе за рэалізацыю **пастановы ЦК аб транспарце.**

Мы маем значнае паляпшэньне партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам **у саўгасах, калгасах і МТС.** Можна назваць сельячэйкі **Хальч** (Жлобінскага раёну), **Азарыцкую сельячэйку** (Магілёўскі раён), **парт'ячэйку саўгасу «Турэк»** (Рагачоўскага раёну), **Кармянскую парт'ячэйку** (Церахаўскага раёну) і г. д., якія штодзенна займаюцца работай сваіх нізавых газэт.

Узоры парткіраўніцтва паказвае парт'ячэйка саўгасу «Брылеў» (Гомельскі раён). Канкрэтна кіруючы, прымаючы ўдзел у рэйдах, правяраючы работу пасобных газэт, парт'ячэйка дабілася вялікіх посьпехаў. Газэта на конкурсе «Правды» высунута на сацыялістычнае пярэдзьне. Сакратар ячэйкі заяўляе «**я сабе не ўяўляю працаваць без газэты**».

Забясьпечыла парткіраўніцтвам сваю насьценгазэту рабочая калгасу «**Расьсьвет - пераможца**» (Жлобінскі раён). Ячэйка вылучыла ў рэдкалегію лепшых партыйцаў, рэгулярна заслухоўвае даклады аб працы насьценгазэты на бюро і сходах ячэйкі, дабіваецца рэагаваньня на ўсе зьмешчаныя ў газэце матар'ялы.

Неабходна адзначыць **новае ў парткіраўніцтве** нізавым друкам у сельячэйках—гэта **вылучэньне спэцыяльных сельпартарганізатараў друку.**

Але на жаль **ня ўсе** партыйныя ячэйкі **ТАК** разгарнулі работу. **Вялікая колькасьць ячэек,** асабліва ў калгасах і саўгасах усутыч да пытаньня рабселькораўскай работы яшчэ не падыйшлі. У асобных выпадках (саўгас «**Доктаравічы**») нават ёсьць факты простага апартуністычнага ігнаравань ня значэньня нізавога друку. Задача ў тым, каб у бліжэйшы час дабіцца забясьпячэньня парткіраўніцтва нізавым друкам ва ўсіх партыйных ячэйках.

Вялікая роля ў рэалізацыі гэтых дырэктыў ускладаецца па **рабселькораўскія камісіі пры партыйных камітэтах.** Між тым у большасьці раёнаў гэтыя камісіі нават ня створаны. Там сям гэтыя камісіі арганізаваны, але па сутнасьці яны не працуюць. Задача райкомаў партыі — дырэктыву ЦК УсеКП(б) аб **рабселькораўскіх камісіях** рэалізаваць, ператварыўшы іх у баявыя штабы канкрэтнага, апэрацыйнага, штодзённага кіраўніцтва рабселькораўскім рухам і нізавым друкам.

Асабліва важна падкрэсьліць, як недахоп, што стан партыйнага кіраўніцтва, а значыць і сама работа нізавога друку, у саўгасах і МТС значна адстае ад тых вялізарных задач, якія стаяць перад МТС і саўгасамі. ПЕРАТВАРЫЦЬ НІЗАВЫ ДРУК МТС І САЎГАСАЎ У ПЕРАДАВОЕ БЫДУЧАЕ ЗЬВЯНО НІЗАВОГА ДРУКУ ВЁСКІ—ТАКАВА ЗАДАЧА БЛІЖЭЙШАГА ЧАСУ РАБОТЫ.

Значна большая ўвага рабоце нізавога друку і з рабселькорамі павінна аддавацца і **раённымі і цэнтральнымі газэтамі,** але рад раённых (**Мсьціслаўль, Горкі, Лагойск**) і цэнтральных («**Чырвоная зьмена**», «**

ЛАБІНСКІЯ КАЛГАСЬНІКІ ДАЮЦЬ АДПОР ЗАСТРЭЛЬШЧЫКАМ ІНТЭРВЭНЦЫІ

Белабандыт Гаргулаў—заядлейшы вораг працоўных, паплечнік ката-генэрала Пакроўскага

ЛІСТ КАЛГАСЬНІКАЎ СТАНІЦЫ ЛАБІНСКАЙ

Мы, калгасьнікі станіцы Лабінскай, якія ведаем Паўла Гаргулава, ураджэнца нашай станіцы, заяўляем працоўным усяго сьвету, што забойца французкага прэзыдэнта Думэра **Гаргулаў зьяўляецца сынам афіцэра, памешчыка. Усе ўладаньні Гаргулавых канфіскаваны і перададены ў наша карыстаньне.** Сам Паўла Гаргулаў у 1918 г. прымаў актыўны ўдзел у барацьбе супроць савецкай улады, будучы афіцэрам у арміі генэралаў Шкуро, Дзянікіна і Ўрангеля.

На нашых вачох таксама праходзіла контр-рэвалюцыйная работа Паўла Гаргулава ў станіцы Лабінскай. У 1918 годзе Гаргулаў вярнуўся ў станіцу ўжо ў чыне падпаручыка.

Хутка стала ясным, дзеля чаго вярнуўся Гаргулаў. Партызаны Лабінскай станіцы своячасова ўскрылі падрыхтоўку да процыцкага паўстаньня казачага афіцэрства. Своячасова быў захоплен арганізатар афіцэрскай сотні Аляксандр Еўстаф'еў. У сылісах змоўшчыкаў мы знайшлі і Паўла Гаргулава. Гаргулаў уцёк, але зноў зьявіўся, калі чырвоныя партызанскія часьці вымушаны былі пачаць адступаньне.

Гаргулаў зноў па сьлядох нашых часьцей у атрадах вядомага ката — генэрала Пакроўскага.

У 1920 г. Гаргулаў зноў зьявіўся. Ён зьняў пагоны і прыпадзіўся фэльчарам. І зноў быў выкрыт гэты бандыт. Ён аказаўся на чале мясцовага аддзяленьня «Карнілаўскага саюзу вызваленьня ад бальшавіцкага ярма». Акрамя яго, на чале аддзяленьня сталі Шухарын і Лявонцьеў. Гаргулаў займаўся таксама перакідкай белых афіцэраў у Крым, заняты тады ўрангелеўцамі.

У лютым 1921 г. Паўла Гаргулаў быў прыгаворан да расстрэлу калегіяй ермакоўскай акруговай ЧК. Белабандыт Паўла Гаргулаў змог своячасова захавацца і ўцячы за граніцу. Такім чынам, Гаргулаў уникнуў расплаты за свае контр-рэвалюцыйную работу ў Савецкім саюзе.

Мы, калгасьнікі і партызаны, звяртаем увагу працоўных усяго сьвету, што зьлейшыя ворагі Кастрычніцкай рэвалюцыі і савецкай улады, каты рабочых, сялян і працоўных казакаў, царскія охраньнікі і жандары, капіталісты і памешчыкі, таксама як контр-рэвалюцыянэр і правакатар Паўла Гаргулаў, знаходзілі і знаходзяць прытулак і абарону ў капіталістычных краінах.

Стрэл Гаргулава ясна паказаў, што выкінутая намі з Кубані, з Дону, з Крыму, выгнаная з Архангельску і з Далёкага Ўсходу белагвардзейская сволач, на чале са сваімі генэраламі-катамі, пад апекай капіталістаў, усё яшчэ точыць зброю супроць Савецкага саюзу, супроць рабочых і калгасьнікаў.

Мы сваім лістом праз бальшавіцкую «Правду» папярэджваем усіх працоўных, што гэтыя белагвардзейскія атрады, якіх утрымліваюць капіталісты, зьяўляюцца застрэльшчыкамі правакацый супроць савецкай улады, падпальшчыкамі новай бойні, гэта перадавыя атрады, якія сусьветны капітал рыхтуе для нападу на нас у імя ўласнага выратаваньня.

ПРАЦОЎНЫЯ ЎСЯГО СЬВЕТУ!

Патрабуйце выгнаньня гэтых белабандытаў з сваіх краін. Памятайце, што яны зьяўляюцца і вашымі ворагамі. Памятайце, што іх рукі пакрыты крывёю лепшых рабочых, сялян і казакаў, якія змагаліся за зьвяржэнь не капіталістаў, памешчыкаў і кулакоў у Расіі. Не давайце прытулку катам працоўных!Ганеце вон правакатараў новай сусьветнай вайны!

Мы, калгасьнікі і партызаны Лабінскай станіцы абураны нахабнымі, паклёпніцкімі правакацыямі буржуазных газэт, якія прабавалі ўскладніць адносіны паміж Савецкім саюзам і Францыяй, уцягнуць нас у вайну, перашкодзіць пасьпяховаму сацыялістычнаму будаўніцтву нашых калгасаў. Мы — жывыя сьведкі актыўных дзеяньняў белагвардзейца Гаргулава супроць Саветаў. Мы заяўляем аб гэтым усяму сьвету.

Мы, калгасьнікі і партызаны, вітаем словы прывадыра нашай Чырвонай арміі тав. **Варашылава**, мы разам з ім заяўляем: «у бальшавікоў нервы моцныя, мы на правакацыю не паддамося». Мы будуем сацыялізм. Посьпехі гэтага будаўніцтва можна бачыць і на Кубані. Кубань стала калгаснай. Пад кіраўніцтвам правадыра камуністычнай партыі **тав. Сталіна** рабочая кляса будуе гіганцкую прамысловасьць і ў будучым годзе ўжо ўсе калгасы Кубані будуць поўнасьцю мэханізаваны: рабочыя Харкава, Сталінграда, Растова, Саратава і іншых рабочых цэнтраў забясьпечаць нашы палі савецкімі трактарамі, плугамі, сяўркамі, камбайнамі і малатарнямі. Вось чаго мы дасягнулі. І мы абавязваемся поўнасьцю забясьпечыць рабочую клясу хлебам і шырока разгорнуўшым калгасным гандлем узмацніць снабжэньне працоўных Савецкага саюзу.

Мы будуем сацыялізм і ня хочам адрывацца ад гарачай будоўлі. Але мы просім «Правду» перадаць працоўным усяго сьвету, і няхай белагвардзейшчына і капіталісты гэта таксама запамятаюць, што ў выпадку нападу на Савецкі саюз, па першым закліку камуністычнай партыі мы, калгасьнікі і партызаны станіцы Лабінскай, выйдзем на бой за сусьветную рэвалюцыю.

У гады грамадзянскай вайны мы біліся ня дрэнна, аб гэтым ведаюць белагвардзейшчына і яе тэнэралы. Аб гэтым можа расказаць сам Гаргулаў. І ў апошні бой мы выйдзем разам з нашай моладзьдзю і дакажам, што перамагаць мы не развучыліся».

Па даручэньні калгасьнікаў і партызан станіцы Лабінскай: (ПОДПІСЫ). («ПРАВДА»).

Заўтра адкрываецца ўсебеларуская навукова-дасьледчая канфэрэнцыя

Усім райкомам КП(б)Б, партарганізацыям НДІ і мясцовым СНР

25 мая склікаецца ўсебеларуская канфэрэнцыя па складаньні пяцігадовага пляну разьвіцьця навукова-дасьледчай работы ў БССР. Гэта канфэрэнцыя мае вялізарнае палітычнае значэньне ў справе разгортваньня нацыянальна-культурнага будаўніцтва, у справе мабілізацыі навукі на службу сацыялістычнаму будаўніцтву.

Культпропы РК, партыйныя арганізацыі навукова-дасьледчых установаў і мясцовыя сэкцыі навуковых работнікаў павінны забясьпечыць належную падрыхтоўку і шырокі ўдзел у канфэрэнцыі лепшых прадстаўнікоў навукі, тэхнікі і навуковай грамадзкасьці.

Культпроп ЦК КП(б)Б ЗАЛАТУХІН.
ЦБ СНР БССР ГЕРШЭЛЬМАН.

Перад канфэрэнцыяй

* Для правядзеньня растлумачальнай работы сярод рабочых аб значэньні і задачах усебеларускай канфэрэнцыі па навукова-дасьледчай рабоце ў другой пяцігодцы, масавы сэктар Беларускай Акадэміі Навук прымацаваў рад навуковых работнікаў да фабрык і заводаў г. Менску. Таксама камандыраваны навуковыя работнікі ў Віцебск, Гомель, Магілеў і інш. гарады.

* Беларуская Акадэмія Навук зьвярнулася з таварыскім лістом да арганізацый фабрык, заводаў, саўгасаў, калгасаў, МТС і адказных кіраўнікоў цэнтральных і раённых установаў з прапановай выказаць на старонках друку свае думкі і патрабаваньні да канфэрэнцыі.

* 21 мая у БАН адбылася нарада дакладчыкаў і кіраўнікоў сэкцый канфэрэнцыі, на якой зацьверджаны тэзісы дакладаў і парадак работы сэкцый.

* Да канфэрэнцыі падрыхтавана выстаўка вынікаў правядзеньня дакадніка БАН у Віцебску і Гомелі.

* На канфэрэнцыю запрошаны прадстаўнікі навукова-дасьледчых і плянуючых установаў БССР і нацыянальных рэспублік.

* Прэзыдыум БАН, у сувязі са скліканьнем канфэрэнцыі, атрымаў прывітальную тэлеграму ад прэзыдыуму Дзяржпляну СССР.

* Канфэрэнцыя адкрываецца 25 мая ў 7 гадз. вечара ў Доме Камасьветы. Запрашальныя білеты разасланы па прадпрыемствах, установах і арганізацыях. Выдача дэлегацкіх мандатаў праводзіцца ў БАН з 9 гадз. раніцы 25 мая (пакой № 23).

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Кузьнецкая домна перавысіла праектную магутнасьць

СТАЛІНСК. 20 МАЯ КУЗЬНЕЦКІЯ ДОМЕНШЧЫКІ ДАБІЛІСЯ НОВАГА РЭКОРДУ: ЯНЫ ВЫДАЛІ Ў 6 ПЛАВАК 947 ТОН ПЕРАДЗЕЛЬНАГА ЧЫГУНУ. АСАБЛІВА ДОБРА ПРАЦАВАЛА КАМСАМОЛЬСКАЯ БРЫГАДА НА ЧАЛЕ З ІНЖЫНЭРАМ-КАМСАМОЛЬЦАМ ТАВ. **ГРЫЦКО.** БРЫГАДА ЗА ЗЬМЕНУ ДАЛА ТРЫ ПЛАЎКІ.

***

Кузьнецкая домна № 1 мае 826 кбм. аб'ёму. Выплавіўшы за суткі 947 тон перадзельнага чыгуну, домна дабілася каэфіцыенту выкарыстаньня аб'ёму—0,87. Гэта бліскучы паказальнік. Перадавыя германскія домны дасягнулі каэфіцыенту выкарыстаньня аб'ёму доменных печаў на 0,85.

Такім чынам кузьнецкія доменшчыкі, сьледам за магнітагорскімі, паказалі ўзор эксплёатацыі вялікіх домнаў, абсталяваных паводле апошняга слова тэхнікі.

Пробны пуск Чалябінскага кісароднага заводу

ЧАЛЯБІНСК. 20 мая адбыўся пробны пуск Чалябінскага кісароднага заводу. На заводзе поўнасьцю закончаны будаўнічыя і мантажныя работы. 18 мая кісародны завод быў уключан у галоўную электрамагістраль. Выпрабаваньне матораў і мэханізмаў выявіла некаторыя дэфэкты, якія былі ліквідаваны на-ходу.

У часе пробнага пуску ўсе мэханізмы працавалі добра. У 6 гадзін вечара атрымана першая партыя кісароду.

Брыгада тав. КАБАНОВА мантыруе электрапеч у сталяліцейным цэху Уралмашбуду, які ўступае ў пускавы пэрыяд.

***

Закончан мантаж лініі перадачы Днепрабуд-Днепрапятроўск

КІЧКАС. Трыкутнік лініі перадачы Днепрабуд - Днепрапятроўск рапартуе, што ўдарны калектыў мантажнікаў лініі дабіўся перамогі: 18 мая поўнасьцю закончан мантаж лініі да 149 пікету, устаноўлены мачты, замацаваны тросы і дрот.

На першай БелДРЭС

17 мая на першай Белдрэс выпрацавана 159.000 кілёват-гадзін электраэнэргіі, што складае **88 проц. заданьня.** Максымум дасягнуў 8.500 кілёват, мінімум—5.400 кілёват, сярэдняе — 6.625 клв.

18 мая выпрацавана 142.000 кілёват-гадзін — **80 проц. пляну.** Максымум — 8.250 клв., мінімум—5.100 клв., сярэдняе — 5.917 клв.

За 19 мая выпрацавана 149.000 кілёват-гадзін — **82,3 проц.** заданьня. Максымум—8.100 клв., мінімум—4.750 клв., сярэдняе — 6.200 клв.

Разгрузак 17, 18 і 19 мая ня было.

На Менскай электрастанцыі

За другую дэкаду мая **Менская электрастанцыя** выпрацавала 679.545 клв. электраэнэргіі, што складае 95,7 проц. пляну. На працягу дэкады прастой фідэраў складаў 15 фідэр-гадзін.

Будматар'ялы

Рагачоўскі лесазавод імя Халтурына 19 мая расьпланаў 301,5 кбм. сыроду, што складае **108 проц. заданьня.**

За 21 мая **дрэваапрацоўчы камбінат «Камінтэрн»** расьпланаў сыроду 214,2 кбм. — **92,4 проц. пляну.**

***

Заводам «Інтэрнацыянал» 19 мая выраблена 883,5 кгр. шрубаў, што складае 97,4 проц. заданьня.

***

Завод «Чырвоны Кастрычнік» 20 мая замест прадугледжаных 6.880 кгр. будаўнічых цьвікоў даў усяго 2.340 кгр., што складае 34 проц. пляну.

Папера

Добруская паперовая фабрыка «Герой працы» за 19 мая выпусьціла 53,4 тоны паперы, што складае ўсяго 65,6 проц. сутачнага заданьня.

Саломенай цэлюлёзы выпушчана 10 тон — 84 проц.

Фабрыка пачала выпрацоўку дроўмасы, якой за 19 мая выпушчана 3 тоны — 34 проц. Прастой машын—33 гадз., замест прадугледжаных яля нас 9 гадз.

Абутак

Гомельская абутковая фабрыка «Праца» 19 мая выпанала прамфінплян на 70,2 проц. Выпушчана 2.275 пар абутку.

Вопратка

Менская швейная фабрыка **«Кастрычнік»** выканала свой прамфінплян за 20 дзён мая на 98,2 проц. Выпушчана 57.229 польтаў.

***

На 513.000 руб. (85,2 проц. пляну) дала прадукцыі гомельская **швэйная фабрыка «Камінтэрн»** за 20 дзён мая.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

Закладка музэю катаргі і ссылкі

МАСКВА. Адбылася ўрачыстая закладка палацу катаргі і ссылкі. Кароткі мітынг быў адкрыт уступным словам **Фэлікса Кона.**

— Мы будуем гэты палац не для сябе, — сказаў Кон, — мы будуем гэты палац для таго, каб кожны рабочы, кожны калгасьнік, кожны камсамолец, наведаўшы яго, могчы убачыць, як рабочая кляса змагалася за сваё вызваленьне. Мы хочам, каб засвоўны поспыт адыпоўных пакаленьняў—змагароў рэвалюцыі, працоўныя Савецкага саюзу давялі ў справу, пачатую намі, справу пабудовы сацыялістычнага грамадзтва.

З гарачымі прывітаньнямі з нагоды закладкі палацу выступілі т. **Варонін** — ад таварыства старых бальшавікоў, **Сапажкоў** — ад рабочых ударнікаў, заняты на пабудове, **Дзідро** — ад ЦК Мопру, **Міцкевіч** — ад музэю Рэвалюцыі. Апрача таго быў агалошан прывітальны ліст ад **Веры Фігнэр**, якая не магла асабіста наведаць закладку палацу. Першы камень закладаў Ф. Кон.

Сход пастанавіў паслаць прывітаньне ЦК УсеКП(б), ЦВК СССР, Массавету.

Будаўніцтва палацу будзе закончана ў 1933 годзе.

Пабудова магутнага цэмэнтнага заводу ў Туркмэніі

АШХАБАД. Прыбыўшая ў Туркмэнію камісія саюзцэмэнту ўстанавіла месца будаўніцтва магутнага цэмэнтнага заводу ў Бэсмейне. Пабудова пачнецца ў канцы трэцяга квартылу. Вытворчая магутнасьць заводу — **адзін мільён бочак цэмэнту ў год.** Прадукцыйнасьць заводу можа быць даведзена да двух мільёнаў бочак. Завод будзе займаць плошчу ў 8 квадратных кілёмэтраў і будзе ўвесь мэханізован і забясьпечан навейшым абсталяваньнем. На сваім абсталяваньні і магутнасьці завод ня будзе мець роўных ня толькі ў Саюзе, але і Эўропе. На заводзе намечана пабудаваць узорны работы пасёлак на 2.000 рабочых. Пасёлак будзе акружан зонай зялёных насаджэньняў на плошчы 700 га.

Паведамленьні

— 24-V-32 г., роўна ў 7 гадз. веч., у памяшканьні Дому Камасьветы (уваход з вул. Энгельса, 2-гі паверх) адбудзецца кансультацыя т. Кавалёва (ЦОПСВ) па пытаньні напулярызацыі пастаноў IX Усесаюзнага зьезду прафсаюзаў. На кансультацыю павінны зьявіцца агітмасавыя работнікі партколектываў, ячэек, камсамольскіх калектываў і яч. фабзаўмясцкомаў і цэхкомаў. Запрашаюцца работнікі рабочых клюбаў.

25 мая, у 7 гадз. веч. гарком КП(б)Б, тарпрафсавет і рэдакцыя радыё-газэты «За бальшавіцкія тэмпы» склікаюць у памяшканьні рэдакцыі «ЗБТ» (Універсытэцкая, 16) агульна-гарадзкую нараду рэдактароў шматтыражак, насьценных газэт і гарадзкіх рабкораў радыё-газэты «ЗБТ». Парадак дня: 1) Роля і задача друку ў правядзеньні першай менскай гарадзкой канфэрэнцыі радыё-слухачоў. 2) Аб выкарыстоўваньні фабзаўдрукам матар'ялаў, бюлетэней «Белта».

Гарком КП(б)Б, Менгарпрафсавет, рэдакцыя «ЗБТ».

— 26 мая, роўна ў 6 гадз. веч., у залі пасяджэньня Менгаркому адбудзецца нарада сакратароў партыйных калектываў і ячэек, старшынь фабзаўмясцкомаў—партыйцаў прадпрыемстваў, устаноў гораду, сакратароў вайсковых ячэек, рэдактараў шматтыражак і прадстаўнікоў цэнтральных газэт—партыйцаў.

— Партколегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 26-V—32 г. у т. Менску (ПК ЦКК) у 6 гадз. веч. адбудзецца пасяджэньне ПТ ПКК КП(б)Б па разглядзе матэрыялу наступных т. т. Брадзіна, Нікулін, Дзьмітрыеў, Малочка, Каган С., Пауловец В. Т., Журомскі І. П., Трыфанаў Сяргей, Тумілевіч Ю. К., Батура Н. В., Сьвярыдаў, Гмельштэйн З. Н., Бродкін Д. Л., З. Р., Фрадкін, Фікс, Алісікаў Я. Р., Ткачэнка Д. Д., Місіянскі І. І., Дзегцяр П. І., Аўчынныкаў Ф. А., Шахрай П., Кіраянка М. А., Габрыель Я. В., Марголін Н., Іванкевіч С. Л., Сідаровіч Г. Г., Рыжкоў Е. А., Мухіна З. Р., Розэнгаў М. П., Карасік С. Р., Табенкін Ш. А., Паянкоў Л. М., Чорнаўсік К. Я. Яўка пераліченых т. т. абавязкова.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Прытоны белагвардзейскіх тэрарыстаў у Парыжы

ПАРЫЖ, 20. «Юманітэ» друкуе новы артыкул тав. Маньена аб **«Прытонах белагвардзейскіх тэрарыстаў».** У артыкуле апісваецца дзейнасьць Бурцава і яго «ацыянальнага рускага камітэту», арганізаванага ў Парыжы ў 1921 г. **у мэтах агульных дзеяньняў усёй белагвардзейскай эміграцыі супроць савецкай улады.** У артыкуле ўказваецца, што ў праграме бурцаўскага камітэту значыцца **ўзброеная барацьба супроць бальшавізму.** Старшынствуе ў камітэце Карташоў, таварышамі старшыні зьяўляюцца былы царскі міністар гандлю і прамысловасьці Фёдараў, былы міністар Урангеля, адзін з правадыроў рускіх манархістаў за граніцай і галоўны кіраўнік газэты «Возрождение» Струвэ рэдактар тэй-жа газэты Сямёнаў, князь Доўгарукаў і, нарэшце, былы дэпутат Бурцаў.

Камітэт мае ў розных краінах сэкцыі, у першую чаргу ў краінах-васалах—Францыі, у Чэха-Славакіі (сэкцыю ўзначальвае Савіцкі) **і ў Югаславіі** (сэкцыю ўзначальвае Салтыкоў), потым у Баўгарыі, Германіі, Турцыі і г. д.

Шматлікія палітычныя групоўкі белай эміграцыі далучаюцца да камітэту, стваравючы так званы «Рускі нацыянальны саюз», дзейнасьць якога выявілася ў радзе варожых Савецкаму саюзу заяў Радзе Лігі нацый і розным эўрапейскім урадам. **Да 1924 г. «Камітэт» разам з «Торгпромом» вёў жорсткую кампанію супроць прызнаньня савецкага ўраду Францыяй.**

Маньен прыводзіць сваю гутарку з асобай, якая добра ведае Бурцава, і якая заявіла, што Бурцаў арганізаваў у 1919 г. у Парыжы тэлеграфнае агенцтва пад назвай «Единение», якое мела сваёй мэтай **распаўсюджваньне ілжывых вестак аб становішчы ў Савецкім саюзе.** У гэтым прадпрыемстве прымалі ўдзел вядомы рускі капіталіст Трацьцякоў, Барыс Савінкаў, Канавалаў і былы царскі пасол у Парыжы—Ізвольскі.

Адначасова Бурцаў рэдагаваў газэту «Общее дело» і выдаваў антысавецкія брашуры. Асоба, якая інфармавала тав. Маньена, адзначае, што немагчыма адмаўляць, што **Бурцаў атрымліваў для сваіх мэтаў і зараз атрымлівае субсыдыі ад французскага міністэрства замежных спраў. Бурцаў зьяўляўся і зьяўляецца агентам Калчака, Дзянікіна, Урангеля, агентам «Торгпрома», агентам французскага імпэрыялізму, і ўсе яны карысталіся і карыстаюцца яго паслугамі для барацьбы супроць СССР.** Звыш таго, ён яшчэ **брудны правакатар, зьвязаны з газэтай «Віктуар»,** якая выдаецца рэакцыйным шавіністам Эрве, і з паліцэйскай «Лібэртэ».

У пацьвярджэньне сваіх слоў гэта асоба ў гутарцы з Маньенам прыводзіць рад дакумантаў і сярод іх тэлеграму, адпраўленую ў сьнежні 1919 г. Трацьцяковым з Сібіры ў Парыж Бурцаву, дзе Трацьцякоў, паведамляючы аб выкананай рабоце, патрабуе прысылкі грошай. Другая тэлеграма, падпісаная Саблiным, упаўнаважаным Калчака ў Лёндане, інфармуе Калчака аб становішчы бурцаўскай групоўкі ў Парыжы і падкрэсьлівае крайнюю неабходнасьць таго, каб **антыбальшавіцкую прапаганду ўзялі на сябе сацыялісты.**

Далей Маньен устанаўляе, што **Бурцаў і ў сучасны момант праводзіць сваю правакатарскую работу.** «Общее дело», якое выдаецца ім, зьмяшчаецца ў т. зв. «Лібэры Рюс» (вуліца Кюжа ў Лацінскім квартале), на чале якой стаіць другі правакатар—Ротштэйн. Маньен напамінае, што ў «справе Куцёпава» Бурцаў падтрымліваў антысавецкую кампанію парыскай прэсы сваімі сэнсацыйнымі выкрыцьцямі і некалькі раз паводле дырэктыў французкай паліцыі і Дзтэрдзіна выяжджаў за граніцу.

Маньен адзначае, нарэшце, што ня высьветлена яшчэ роля Бурцава ў забойстве Думэра, ня гледзячы на той факт, што напярэдадні замаху Гаргулаў правёў ноч у гасьцініцы па суседзтве з рэдакцыяй «Общего дела». Маньен адзначае з гэтага повада: **«Сувязі Бурцава з французкім міністэрствам замежных спраў, з «Торгпромом» і з рускім агульна-вайсковым саюзам генэрала Мілера тлумачаць нам, чаму яго да гэтага часу ня турбавалі».**

„Вон Гаргулавых з Чэха-Славакіі!"

Баявыя дэманстрацыі рэвалюцыйнай моладзі

ПРАГА. 15 і 16 мая ва многіх прамысловых раёнах Чэха-Славакіі АДБЫЛІСЯ ШМАТЛЮДНЫЯ ЗЬЛЁТЫ РАБОЧАЙ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ МОЛАДЗІ пад лёзунгамі: «ВОН БЕЛАГВАРДЗЕЙСКІХ ТЭРАРЫСТАЎ ГАРГУЛАВЫХ З ЧЭХА-СЛАВАКІІ», «СУПРОЦЬ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ, НА АБАРОНУ САВЕЦКАГА САЮЗУ» і інш.

Дэманстрацыі насілі выключна баявы характар. Ня гледзячы на ўмяшаньне паліцэйскіх упадаў, у Грэттаў (каля Рэйхенбэрга) у зьлёце прыняло ўдзел каля 5 ТЫС. ЧАЛАВЕК з Мільдэнаў, Варнсдорфа і інш. гарадоў Паўночнай Чэхіі. Такія-ж дэманстрацыі адбываліся ў Бэрынгене, Грасьліцы і Вейнерце. У Обэрлейтэнсдорфэ на вуліцы выйшла звыш 1.000 моладых гарнякоў. Дэманстранты прымусілі паліцэйскія ўлады рэбну ўбраць паліцыю на гэты дзень з вуліц гораду.

Дэманстрацыі адбываліся таксама ў Простейове, Шпэрове, Галашове, Брно і інш. гарадох Маравіі. У Остраўскім раёне адбылося 5 мітынгаў рабочай моладзі. У Бэроўне (Сярэдняя Чэхія), дзе выступіў з прамовай КАМУНІСТЫЧНЫ ДЭПУТАТ СВАБОДА, паліцыяй арыштавана 17 чалавек.

У пагранічным з Германіяй Бодэнбаху на зьлёце выступілі прадстаўнікі германскага камсамолу, а сход, які ператварыўся ў дэманстрацыю рэвалюцыйнай зьмычкі рабочай моладзі Германіі і Чэха-Славакіі, быў распушчан паліцыяй.

Ангельскія рэзыдэнты падтрымліваюць японскія пляны ў Шанхаі

ШАНХАЙ, 2. Асацыяцыя ангельскіх рэзыдэнтаў адкрыта выступіла з падтрыманьнем японскіх патрабаваньняў аб незадаволным скліканьні канфэрэнцыі для вырашэньня пытаньняў аб будучым статусе Шанхаю. Асацыяцыя патрабуе, каб былі створаны выраішаны пытаньні аб эксцэрыторыяльных суднах, дарогах, што мяжуюцца з сэтльмэнтам, а таксама аб знаходжаньні кітайскіх войск у ваколіцах Шанхаю, якія зьяўляюцца вечнай пагрозай мірнаму разьвіцьцю Шанхаю.

У кітайскіх колах выступленьне брытанскай асацыяцыі выклікала рэзкае неадабрэньне, тым больш шкодзе, што кітайскі ўрад прабуе прадставіць Англію, як прыяцеля Кітаю. Старшыня федэрацыі асацыяцыі «Нацыянальнага выратаваньня» заявіў, што магчымы антыангельскі байкот.

За выкрыцьцё ваенных паставак для Японіі—канфіскацыя газэты

БЭРЛІН. Эрфуртскі паліцэй-прэзыдэнт канфіскаваў нумар камуністычнай газэты «Фольксблат». Паліцыя выйшчыла матрыцы нумару. Памяшканьне рэдакцыі было занята вялікім атрадам паліцыі. Канфіскацыя выклікана шырокай пэрыпэтыкай кампаніяй з повазу ваенных паставак для Японіі.

Варшаўскія апякуны Гаргулавых

ВАРШАВА, 21. Варшаўскі «Кур'ер поранны» піша, што забойства Думэра белагвардзейцам Гаргулавым адгукнулася голасным рохам у Вільні. У Вільні жыў нідовы тарарыст Якаўлеў, рэдактар газэты «Новая Россия». «Кур'ер поранны», выказваючы сумненьне, ці зьяўляецца віленскі Якаўлеў асобай, аб якой гавораць французскія газэты, бяро пад абарону віленскага Міхаіла Якаўлева, былога есаула, шчырага рускага патрыёта, ворага бальшавікоў. Віленскі Якаўлеў быў выязан з забойцай Войкава Кавардай і даў апошняму рэвальвэр. Ён арганізаваў віленскую тэрарыстычную групу моладзі. Якаўлеў быў дапытан паліцыяй у сувязі са спраўай Трайсенэйча, справай Валенцінавых, якія прабіраліся ў Літву з мэтай забіць савецкага пасла Александроўскага. Потым Якаўлеў выехаў у Парыж, дзе і жыў. Артыкул у «Кур'еры поранным» лішні раз падкрэсьлівае сувязь польскіх колаў з белымі тарарыстамі.

Гаміндан баіцца праўды аб СССР

ШАНХАЙ. Газэта «Чайна форум» паведамляе, што **аддзел друку Гаміндану аддаў загад, які прапануе газэтам не публікаваць паведамленьняў аб пакараньні сьмерцю камуністаў у Кітаі,** бо гэта робіць дрэннае ўражаньне за граніцай. **Газэтам прапануецца не паведамляць аб посьпехах у выкананьні пяцігадовага пляну СССР,** бо гэты плян хоць і аскальцаўляецца з палітым посьпехам, але пярочыць прыпушчам Гамінданаў. У распараджэньніазначаецца, што многія газэты зьмяшчаюць весткі аб пяцігодцы без крытыкі, такія паведамленьні інспіруюць пасьсьпяцтва, тармозяць кампанію па задушэньні чырвоных.

За 21 мая

Гарачэўскі лесазавод імя Халтурына 19 мая расьпланаў 301,5 кбм. сыроду, што складае **108 проц. заданьня.**

За 21 мая **дрэваапрацоўчы камбінат «Камінтэрн»** расьпланаў сыроду 214,2 кбм. — **92,4 проц. пляну.**

***

Заводам «Інтэрнацыянал» 19 мая выраблена 883,5 кгр. шрубаў, што складае 97,4 проц. заданьня.

***

Завод «Чырвоны Кастрычнік» 20 мая замест прадугледжаных 6.880 кгр. будаўнічых цьвікоў даў усяго 2.340 кгр., што складае 34 проц. пляну.

Папера

Добруская паперовая фабрыка «Герой працы» за 19 мая выпусьціла 53,4 тоны паперы, што складае ўсяго 65,6 проц. сутачнага заданьня.

Саломенай цэлюлёзы выпушчана 10 тон — 84 проц.

Фабрыка пачала выпрацоўку дроўмасы, якой за 19 мая выпушчана 3 тоны — 34 проц. Прастой машын—33 гадз., замест прадугледжаных яля нас 9 гадз.

Абутак

Гомельская абутковая фабрыка «Праца» 19 мая выпанала прамфінплян на 70,2 проц. Выпушчана 2.275 пар абутку.

Вопратка

Менская швейная фабрыка **«Кастрычнік»** выканала свой прамфінплян за 20 дзён мая на 98,2 проц. Выпушчана 57.229 польтаў.

***

На 513.000 руб. (85,2 проц. пляну) дала прадукцыі гомельская **швэйная фабрыка «Камінтэрн»** за 20 дзён мая.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на ЧЭРВЕНЬ і да канца году

на газэту

„ЗЬВЯЗДА"

ОРГАН ЦК КП(б)Б.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: 1 мес.—1 руб. 3 мес.—3 руб. | 6 мес.—6 руб. 12 мес.—12 руб.

ПАДПІСАЦЦА МОЖНА на пошце, у лістаносца, у ўпаўнаважаных друку на прадпрыемствах, у калгасах, у кіёсках СНІОЗДРУКУ

па 23 ЧЫСЛО КОЖНАГА МЕСЯЦА.

Не прапускайце апошняга тэрміну падпіскі, бо інакш падпіска будзе перанесена на наступны месяц.

Каб ня было перабою ў дастаўцы газэты, падпісвайцеся на больш доўгі тэрмін—на год ці паўгода.

Абавязкова захоўвайце квіткі аб падпісцы.

Калі вы, падпісаўшыся, не атрымліваеце газэты, зьвярнецеся ў гую паштовую ўстанову, якая павінна вам яе дастаўляць.

Калі на мясцовай пошце нельга дабіцца здавальняючага выніку, перашлеце скаргу ў рэдакцыю (Менск, Савецкая 63, выдавецтва „Зьвязда").

Рассылаецца падпісчыкам і паступае ў продаж

№6 Бальшавік Беларусі №6

ЗЬМЕСТ:

М. М. ПАКРОЎСКІ

Гіндэ — Бальшавіцкая арганізацыя работы забясьпечыць посьпех весняной сяўбы.
Н. Бонэц — Загатоўкі 1931-1932 г. г.
А. Чарнушэвіч — Культурную рэвалюцыю на службу разгорнутаму сацыялістычнаму наступу.
А. Гаруновіч — Аб задачах агітацыйна-масавай работы ў новых умовах.
Рынг — Правы рэвізіянізм і сапраўднасьць капіталізму.

БІБЛІЯГРАФІЯ:

Гедар Лушчыцкі, Яэль — Супроць буржуазна-лібэральных трактовак фашызму.

Матар'ялы і дакументы.

Асноўныя ўстаноўкі для складаньня другога пяцігадовага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры БССР (пастанова Савету Народных Камісараў БССР і Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б).

ПАДПІСНАЯ ЦАНА НА 1932 г.:

На 1 мес.— 40 к. | На 6 м.—2 р. 40 к.
„ 3 мес.—1 р. 20 к. | „ 12 м.—4 р. 80 к.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: на пошце, лістаносцамі і ўпаўнаважанымі па друку па ўсіх прадпрыемствах і ўстановах БССР.

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Ад 24 мая

НОВЫ ГУКАВЫ ГІСТАРЫЧНА-МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

МЁРТВЫ ДОМ

Сцэнары—В. Шкловскага. Музыка—В. Ірунава.
Рэжысэр—В. Фёдараў. Гукаапэр.—С. Вахмістраў.

У ГАЛОЎН. РОЛЯХ:
Дастаеўскі—артыст МХТ Н. ХМЕЛЮ.
Пабеданосцаў . . ПАДГОРНЫ.
Мікалай I—артыст Н. ВІТАЎТАЎ.
Петрашэўскі . В. Б. ШКЛОЎСКІ.
Ген. Дубельт . Н. РАДЗІН.
Салдат . Г. КУЗЬНЯЦОЎ.

...ПЕРАД ВАМІ ПРОЙДЗЕ АДНА З САМЫХ МРАЧНЫХ ЭПОХ РУСКАЙ ГІСТОРЫІ. ГЭТА БЫЛО ЦАРСТВАВАНЬНЕ МІКАЛАЯ I...

ГУК ЗЬНЯТ ПА СЫСТ. Табефон.

ШТОДЗЕННА З СЭАНСЫ.

ПАЧАТАК у 6 гадз., 8 гадз. 15 м. і 10 гадз. 30 м.)—(КАСА—ад 1 гадз.

Дзеці ў кіно не дапускаюцца.

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Мастацкі бытавы фільм Кварталы прадмесьця. У гал. ролі НАТА ВАЧНАДЗЭ

ПРАЛЕТАРЫ — Мастацкі-замежны фільм ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК.

„СПАРТАК" Пач.: 6-30, 8, 9-30, 11 г. Каса—з 5 г. — Выдатны фільм Шчасьлівыя кольцы. Камэдыя ў 6 частках.

АРЦЕЛЬ „УДАРНІК" ПРЫМАЕ НА ПРАЦУ БАНДАРЭЙ, а таксама асоб неквалірыкаваных для абучэньня бандарнай справе. Узрост ад 18 год. Прынятыя забясьпечваюцца стыпэндыяй 50 рублёў у мес. і інтэрнатам. Зьвяртацца па адрасе: Гандлёвая, 30.

Менск, друкарня «Зьвязды» Галоўлітбел № 337

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2